ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дармовым дадатнам „Прафрух")

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагародняя абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаванні—скідка. Зьвыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. -адгаку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсэктар	13-80
Сэктар інфармацыі	13-80
Начны рэдактар	6-42
Галоўная кантора	7-81
Аддзел падпіскі	7-81
» абвестак	7-81

14 стра
Год вы
РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНА
МЕНСК, Савецка

Дабіцца рашучага зруху ў падрыхтоўцы да засеву індывідуальнага с

Безадкладна праверыць давядзеньне пляну засеву да два

Спыніць спробы незаконнага памяншэньня надзелаў індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Не дапускаць адводу ім нявыгодных зямель, калі за межамі калгасу ёсьць блізкія і выгодныя землі

Шырока арганізаваць дапамогу з боку калгасаў маламоцным адзінаасабовым гаспадаркам.

Кожны бядняк і серадняк, які сее індывідуальна, павінен ведаць, што паводл падатку з яго не спаганяецца падатак за павялічаную супроць мінулага году плош адварот, у выпадку, калі ён бяз уважлівых прычын паменшыць пасеўную плошч віцца яе сеяць, падатак з яго будзе спаганяцца па мінулагадовай пасеўнай пло якая яму адведзена, будзе засявацца калгасамі на сваю карысьць.

Пастанова ЦВК і СНК Саюзу ССР

аб мерах садзейнасьці да пашырэньня плошчы засеву індывідуальных сялянскіх гаспадарак

Паведамленьне Народнага Камісарыяту Земляробства Саюзу ССР аб ходзе сяўбы паказвае рэзкае адставаньне індывідуальных сялянскіх гаспадарак у выкананьні засеўных плянаў, што сьведчыць аб недапушчальна няўважлівых адносінах мясцовых саветаў і выканкомаў да задач арганізацыі сяўбы індывідуальнымі гаспадаркамі і стварае пагрозу недавыкананьня агульнага заданьня па пашырэньні засеўных плошчаў.

У сувязі з гэтым ЦВК і СНК Саюзу ССР пастанаўляюць: запрапанаваць ЦВК'ам саюзных і аўтаномных рэспублік, краявым і абласным выканаўчым камітэтам:

1) Неадкладна праверыць давядзеньне пляну засеву да двара ў адносінах да індывідуальных сялянскіх гаспадарак, шырока ўцягваючы ў гэту справу сельсаветы, зямельныя таварыствы, каапэрацыйныя арганізацыі, камітэты ўзаемадапамогі, пасялковыя таварыствы і г. д.

2) Няўхільна ажыцьцяўляючы асноўны закон аб зямляўпарадкаваньні і зямлякарыстаньні, аб прадастаўленьні лепшых і больш выгодных зямель калгасам, рашуча перасякаць спробы вызначэньня індывідуальным гаспадаркам, якія выйшлі з калгасу ці не ўвайшлі ў калгас, нявыгодных зямель, калі за межамі калектыўнага поля ёсьць магчымасьць адводу блізка размешчаных выгодных зямель, так і спробы незаконнага зьмяншэньня разьмераў зямельных надзелаў індывідуальных сялян.

3) Пры выдачы перад сяўбой сялянам, вышаўшым з калгасу, насеньня, унесенага імі раней ў калгасны фонд, абавязкова зьвязваць гэту задачу з абавязковым выкананьнем імі пляну веснавой сяўбы.

4) Прасачыць за няўхільным выкананьнем пастановы Наркамзему Саюзу ССР аб выдачы маламоцным індывідуальным гаспадаркам пазык з наяўных рэсурсаў сельскіх страхавых фондаў тэй часткі, у якой яны былі сабраны ў індывідуальных гаспадарках з абавязацельствам выкананьня імі засеўнага пляну.

5) Дабіцца таго, каб кожны бядняк і серадняк селяніп, які сее індывідуальна, ведаў, што, згодна закону аб сельгаспадатку, з яго не спаганяецца падатак за павялічаную супроць мінулага году плошчу засеву і наадварот, у выпадку, **калі ён бяз грунтоўных прычын паменшыць засеўную плошчу або зусім адмовіцца яе засеяць, падатак з яго будзе спаганяцца паводле леташняй засеўнай плошчы, а зямля, вызначаная яму, павінна засявацца калгасамі ў сваю карысьць.**

6) Шырока арганізаваць дапамогу з боку калгасаў, якія скончылі сваю сяўбу, малазаможным індывідуальным гаспадаркам, якія хочуць, але ня маюць магчымасьці выканаць свой засеўны плян.

7) Скасаваць пункты 8 і 9 прыкладнога кантрактацыйнага дагавору Хлебацэнтру з індывідуальнымі гаспадаркамі, зацьверджанага Наркамгандлем Саюзу ССР ад 1-га студзеня 1930 году.

Старшыня ЦВК СССР М. КАЛІНІН.
Нам. старш. СНК Саюзу ССР Я. РУДЗУТАК.
Сакратар ЦВК СССР ЕНУКІДЗЗ.

Масква, Крэмль. 12-е 30 г.

Брыгадзір—рабочы заводу «Бальшавік» тав. Рэўтовіч растлумачвае бедняку апошнія дырэктывы партыі і артыкул тав. Сталіна (калгас імя Будзёнага).

Прыцягваючы да кіраўнічай работы ў калгасах лепшых сераднякоў, трэба поўнасьцю скарыстаць іх гаспадарчы вопыт

Рашучая барацьба з анты-серадняцкімі настроямі і перагібамі

У многіх мясцох БССР яшчэ не разумеюць, што «без прыцягненьня серадняко ў да кіраўніцтва калгасамі, без скарыстаньня ў КАЛГАСАХ гаспадарчага і арганізацыйнага вопыту серадняка, гутаркі аб арганізацыі працы ў калгасах, аб замацаваньні саюзу рабочае клясы з калгасьнікамі - сялянамі зьяўляюцца пустою балбатнёю па меншай меры». Партыйныя, савецкія і каапэрацыйныя арганізацыі на мясцох яшчэ не прыступілі да рэалізацыі апошніх пастаноў партыі аб разгортваньні выразнай работы па арганізацыі беднаты і батрацтва, аб умелым прыцягненьні гаспадарчага вопыту серадняка да кіраўніцтва і будаўніцтва ў калгасе.

Аб гэтым выразна сьведчыць абсьледваньне пра ўнікамі Калгасцэнтру БССР раду калгасаў у Гомельскай, Мазырскай, Магілеўскай і Віцебскай акругах, выступленьні на раённых калгасных канфэрэнцыях, якія адбыліся гэтымі днямі ў даных акругах.

Папершае, у пераважнай большасьці калгасаў адзначаных 4-х акруг сераднякі ўваходзяць у склад праўленьняў калектываў. У тых-жа адзінкавых калгасах, дзе ў склад праўленьня з 9-ці чалавек уваходзіць 1-2 сераднякі, дык яны ніякай ролі не адыгрываюць, ня маюць ніякай нагрузкі па кіраўніцтве.

Гаспадарчы вопыт серадняка, як правіла, нідзе ў калгасах не скарыстоўваецца. На сходах актывы вельмі часта бываюць такія выпадкі: 2-3-5 «прафсыянапаў» - актывістых трымаюцца абасоблена ад актывістых - серадняко ў, шушкаюцца паміж сабою па пытаньнях, якія ніякага сакрэтнага характару ня маюць.

Кіруючыя калгасныя працаўнікі часам нязьліты ня толькі з серадняком, але нават і з беднатою. Гэта параджае ўнутры калгасу сваласаблівае адміністраваньне, а не здаровую распарадчасьць. Гэта ў радзе калгасаў выклікала разрыў ня толькі паміж кіраўнікамі і калгасьнікамі - сераднякамі, але нават і беднякамі. У пасёлку Краснарэчча, які ўваходзіць у калгас «Энгельс» (Гомельская акруга), напрыклад, упоўнаважаны праўленьня калгасу павёў сябе настолькі абураюча, што выклікаў незадаваленьне ўсіх калгасьнікаў. Ён не кіраваў працаю гэтага аддзяленьня калгасу, а начальствааў, займаўся толькі аддачаю загадаў, зусім ня лічачыся з думкаю калгасьнікаў аб немэтазгоднасьці тых ці іншых мерапрыемстваў. Урэшце, адміністраваньне гэтага маленькага «начальніка», які вельмі ўжо зарваўся, амаль што не давяло да выхаду ўсіх калгасьнікаў пасёлку Краснарэчча з калгасу.

Наколькі ў некаторых калгасах ігнаруюць гаспадарчы вопыт серадняка, сьведчыць наступны факт, які здарыўся ў пасёлку Радзеева, што ўваходзіць у

Жанчыны-трактарыстыя Койданаўскай машынатрактарнай станцыі, якая абслугоўвае 12 калгасаў Койданаўскага раёну, выяжджаюць у поле

азначаны вышэй калгас «Энгельс». Гэтымі днямі ў кантору гэтага аддзяленьня калгасу прышоў серадняк - калгасьнік і адзначыў нейкі недахоп гаспадарчага парадку, які сапраўды мае месца ў Радзееве. Серадняк заявіў, што ён душой балее за гэты непарадак і ня можа ўстрымацца, каб не заявіць аб гэтым. Кіраўнікі з канторы не зьвярнулі нават увагі на дзепаву заўвагу серадняка і прапусьцілі яе міма вушэй. У канторы ў гэты час было чалавек 30 калгасьнікаў - серадняко ў і беднякоў. Убачыўшы, як канторс «рэагуе» на заўвагу добрага гаспадара, яны толькі дакорліва паківалі галавамі — вось, моў, якія парадкі. Нічога дзіўнага няма ў тым, што кулакі ледзь не разбурылі асобныя аддзяленьні гэтага калгасу.

Калгас вёскі Халоднікі, Калінкавіцкага раёну можа служыць яскравым, зусім адваротным прыкладам. Правільныя ўзаемаадносіны з серадняком, скарыстаньне яго гаспадарчага вопыту далі тут найлепшыя вынікі. Гэты калгас арганізаваўся яшчэ мінулай восеньню. У калгас увайшло 95 гаспадарак, з якіх 20 — бядняцкія. Агульнае кіраўніцтва праводзіцца камуністым - кіраўніком куста. Непасрадна-ж калгасам кіруе старшыня праўленьня калгасу — серадняк. Сераднякі і беднякі, якія ўваходзяць у склад праўленьня, працуюць вельмі дружна. Узаемаадносіны паміж імі таварыскія. Вопыт калгасьнікаў-серадняко ў выкарыстоўваецца на ўсе 100 проц. У гэтым-жа калгасе існуе група беднаты, якая таксама працуе вельмі добра. Паміж групаю беднаты і серадняцкім актывам самыя лепшыя адносіны.

У выніку ўсяго гэтага, калгас дабіўся вялізарных дасягненьняў і ўвесь час мацнее. За зіму пабудавана 5 грамадзкіх хлявоў, агульная стайня. Амаль усе старыя дамы зьнесены і пабудаваны новыя. Калгас мае таварную прадукцыю малака і мяса. Усе калгасьнікі жывуць лепш, чым раней.

Урэшце трэба спыніцца на скрыўленьнях лініі партыі ў адносінах да серадняка, якія вынікаюць з парушэньняў дырэктыў партыі аб замацоўваньні саюзу беднаты з серадняцтвам супроць кулацтва, што зьяўляецца асновай калгаснага руху. Мы маем у большасьці калгасаў толькі фармальнае выкананьне дырэктывы аб стварэньні батрацка - бядняцкіх груп. Якасьць-жа іх працы нездавальняючая. Батрацка-бядняцкія групы замкнуліся ў сваім кругу. На сходы груп, пры абмеркаваньні чыста гаспадарчых пытаньняў, серадняко ў не пускаюць, а тых, якія прыходзяць, просяць пакінуць сход.

У калгасе Сухавічы, Капінкавіцкага раёну, напрыклад, сераднякам, якія прышлі на сход батрацка - бядняцкай групы, кіраўнік групы запрапанаваў пакінуць памяшканьне сходу (!), ня гледзячы на тое, што абмяркоўваліся самыя зьвычайныя пытаньні. Аб уплыве, які зрабіла гэта выхадка, гаварыць ня прыходзіцца.

Побач з гэткімі абураючымі выпадкамі, трэба адзначыць прыклад наладжанай узаемнай працы паміж серадняцкім актывам і батрацка - бядняцкай групай у калгасе. У тым-жа пасёлку Радзеева узаемаадносіны паміж беднатой і сераднякамі вельмі добрыя (што, аднак, не гаворыць аб правільных узаемаадносінах ПАМІЖ КІРАЎНІКАМІ аддзяленьня калгасу з сераднякамі). Гэтымі днямі на сход батрацка - бядняцкай групы прышла група серадняко ў - актывістых. Сход папрасіў серадняко ў актывістых застацца і прыняць удзел у абмеркаваньні пытаньняў, якія вырашае беднота.

Артыкулы тав. Сталіна і апошнія дырэктывы ЦК знайшлі спрыяючую глебу сярод серадняцкіх мас. Аб гэтым красамоўна гавораць тыя шматлікія весткі аб прыліве серадняко ў у калгасы, якія атрымліваюцца з усіх округ БССР. Рашучая ліквідацыя антысерадняцкіх настрояў і перагібаў, удалае прыцягненьне да кіруючай працы ў калгасах лепшых людзей з серадняко ў і скарыстаньне іх гаспадарчага вопыту яшчэ больш узмоцніць прыліў у калгасы новых капён серадняко ў і беднякоў, садзейнічаючы хутчэйшаму замацаваньню калгасаў.

В. Л.

Аб правядзеньні ў жыцьцё статуту с.-г. арц

Тлумачэньне Наркамзему СССР

Зацьверджана ЦВК і СН

Пункт 1. Аб нормах здачы (продажу) загат прадукцыі (паводле пункту 22 статуту).

Устанавіць для калгасаў у раёнах пераваж (Паўночны Каўказ, Украіна, Ніжняя і Сярэдняя Ве Урал, Сібір, ЦЧО, Казакстан, Крым) і вырабляючы шых вобласьцяй (норму здачы) продажу таварнай гатоўчым органам ад аднэй чвэрці да аднэй трэці з разьлікаў сярэдняга ўраджаю.

Для калгасаў па-зазбожжавымі раёнамі ўста таварнага збожжа па корме, якая не перавышае а вога збору збожжа. Уся іншая маса валавога збо і па-зазбожжавымі раёнамі застаецца ў поўным

Пункт 2. Аб азімых засевах членаў сельс (паводле пункту 4 статуту).

Ураджай азімых культур, засеяных мінуля ска-гаспадарчых арцеляй у індывідуальным пара кам. Пры абмалоце азімых культур, засеяных у за сабранага збожжа прадаецца засеўшчыкамі загато гаваро ў аб кантрактацыі, частка ідзе ў пасевны аплату калектыўнай уборкі і абмалоту, а рэшта з распараджэньні засеўшчыкаў, прычым ніякіх іншы калгасаў з азімых не праводзіцца.

Пункт 3. Аб аплаце працы ў сельска-гаспада 15 статуту). Аплата працы ў калгасах праводзіцца джаю і іншых прыбыткаў калгасу. Аплата працы шыма, прычым катэгарычна забараняецца аплат унутры калгасу выключна грашыма.

У аснову разьлікаў з калгасьнікамі па лініі колькасьць і якасьць працы асобнага калгасьніка нага сходу калгасьнікаў.

Прызнаць неабходным вылучэньне з валаво падарчых арцеляй і з іх прыбыткаў ад малоўн процантаў для разьмеркаваньня паміж калгасьнік унесенай кожным з іх у абагулены фонд калгасу.

Пункт 4. Аб уступных узносах (па пункце

Устанавіць разьмер уступных узносаў для 5 руб. для батракоў, ад 5 да 25 руб. для беднякоў лежнасьці ад магутнасьці ўступаючай у калгас

Наркамзем СССР Я. ЯКАЎЛЕЎ
Старшыня Калгасцэ

На здымку трактарная калёна, якая нядаўна прыйшла ў Клімавіцкі раён першым пачаў масавы калектыўны рух на Беларусі

З раёну раньняй сяўбы

У БАРАЦЬБЕ ЗА БАЛЬШАВІЦКУЮ СЯЎБУ

У Каралінскім раёне (Мазырчына) зараз налічваюцца 43 калгасы, якія аб'яднаюць 920 гаспадарак на плошчы ў 16. 368 гэктараў (усяго ў раёне 5.950 гаспадарак).

Апошнія дырэктывы партыі аб далейшым замацаваньні калгасаў, артыкулы т. Сталіна і пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б з усёй яскравасьцю выявілі перад раённай партарганізацыяй дапушчаныя работнікамі памылкі ў калектыўным будаўніцтве. Гэтыя-ж дырэктывы далі і напрамак да выпраўленьня памылак. Партарганізацыя зараз перабудоўвае ўсю сваю работу, каб гэтыя памылкі зьніштчыць і па-бальшавіцку правесьці веснавую сяўбу.

Для гэтай мэты райкомам партыі 6-га красавіка была склікана раённая нарада груп беднаты, на якой прысутнічала каля 500 дэлегатаў. Калгасьнікі а вялікай зацікаўленасьцю абмяркоўвалі апошнія дырэктывы партыі аб падрыхтоўцы да сяўбы, аб ільготах калгасам.

***

У той самы час, калі перадавая частка беднаты з калгасаў абмяркоўвала важнейшыя гаспадарчыя і палітычныя пытаньні, клясавы вораг таксама не драмаў.

7-га красавіка кулакамі было падпалена гумно старшыні Каралінскага калгасу. Агонь перакінуўся на суседнія будынкі. Толькі дзякуючы энэргічнай работе калгасьнікаў пажар быў спынены. Згарэлі 4 гумны, 6 хлявоў, 2 хаты і частка дробнай жывёлы калгасьнікаў. Трэба адзначыць поўную непадрыхтаванасьць раённай пажарнай дружыны, якая выехала на пажар толькі праз 50 хвілін.

***

Для арганізацыі пробнага выезду калгасаў у апошнія былі пасланы райкомам партыі 138 работнікаў. 7-га красавіка ў вёсках былі праведзены сходы калгасьнікаў і сялян, на якіх растлумачылі артыкул тав. Сталіна і пастанову ЦК аб ільготах калгасам. А на другі дзень, 8-га красавіка, усе калгасы раёну дружна выехалі ў поле—вазілі гной, аралі, сялі.

Калгасьнікі з Каралінскага калгасу раніцаю выйшлі ў поле. Жанчын выйшла больш, чым было патрэбна. Яны раскідалі гной з такою шпаркасьцю, што яго нават не пасьпявалі прывозіць. У самы разгар работы да калгасьнікаў прыехаў у поле на валох селянін, які нядаўна вышаў з калгасу і заявіў:

Уступаю ў калгас.

За ім у гэты дзень вярнулася ў калгас яшчэ 5 гаспадароў.

Дзень 8-га красавіка быў пачаткам масавай сяўбы ў раёне.

***

Індывідуальныя гаспадаркі да палявых работ пакуль яшчэ не прыступілі. У хатах толькі і гавораць пра тое, што калгас пачаў працаваць. Многія зараз саромяцца падаваць заявы аб прыёме іх у калгас, а хочуць як-небудзь нялрык мэтна далучыцца да калгасу, каб пазбавіцца ад ухмылак з боку калгасьнікаў.

Зямля ўсім калгасам ужо адведзена і каморнікі дапамагаюць зараз сельсаветам вызначаць палосы індывідуальным гаспадаркам. Наогул становішча ў індывідуальным сэктары пагражаючае. Ужо мінула «Благавешчаньне», стаіць добрае і цёплае надвор'е, але індывідуальныя гаспадаркі за работу не бяруцца, за выключэньнем адзінак.

***

У радзе калгасаў зараз адчуваецца ястача ў цягавай і рабочай сіле і насеньні.

Цікава адзначыць наступнае зьявішча. У часе пробнага выхаду ў поле было шмат выпадкаў калі пасобныя сяляне некалгасьнікі дапамагалі калгасам працаваць у полі. Але ў калгас яны ўсё-ж такі ня ўступаюць.

На запытаньне многія адказвалі: «цяпер я вам дапамагаю, а потым вы мне дапаможаце».

Калгасы ад гэтай дапамогі, зразумела, не адмаўляюцца.

У дзень пробнага выхаду ў поле амаль ва ўсе калгасы былі паданы заявы ад сялян з просьбаю прыняць іх таксама ў калектыў. Пачатак сяўбы ў калгасе часта кладзе канец хістаньням многіх серадняко ў.

***

Апрача працоўнага ўздыму сярод калгасьнікаў і часткі індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, пробны выхад у поле выявіў таксама рад недахопаў у рабоце раённых арганізацый. У калгасах дасюль яшчэ няма правілу унутранога распарадку, норм выпрацоўкі і расцэнак. Абмен гатункова насеньня праходзіць вельмі марудна. У раён завезена гатункова аўсу 465 тон, абмецена толькі 84 тоны. Перашкаджае гэтаму тое, што абмен праводзіцца з разьліку 28 фунтаў гатункавага аўса за пуд звычайнага. Такі ліхварскі процант за абмен часта адштурхоўвае сялян. 8-га красавіка прыехалі 4 селяніны мяняць авёс, але як толькі яны даведаліся аб умовах абмену, дык зараз-жа павярнулі аглобалі.

9-га красавіка раённы камітэт партыі даў дырэктыву мяняць авёс пуд за пуд, а ў раздроб за абмен спаганяць 12 фунтаў, пры чым дазваляецца канчатковы разьлік за абмен рабіць увосень, пасьля уборкі ўраджаю.

***

Адначасова пробны выезд выявіў, што ў радзе месц ня толькі ня выпрацоўваюць памылкі, дапушчаныя раней пры арганізацыі калгасаў, але паўтараюць іх яшчэ і цяпер. Некаторыя калгасы яшчэ і дасюль не зьвярнулі індывідуальным гаспадаркам няправільна абагуленага ў іх насеньня. Прычынай гэтага зьяўляецца тое, што некаторыя раённыя работнікі ня хочуць прызнаць сваіх памылак і выправіць іх. Член райвыканкому Марозаў, даведаўшыся, што ў вёсцы Багуцічы калгас раздае індывідуальным гаспадаркам абагуленае ў іх насеньне, забараніў гэта.

Брыгадзіры «Зьвязды» М. Л. і А. Ш.

„ЗЬВЯЗДА"—У КАЛГАС

Сёньня «Зьвяздой» разаслана па ўсіх сель газетах Беларусі асоб выданьнем для пашырэньня ў калгасах і сярод ін відуальных бядняцк радняцкіх гаспадарак № 3 «Зьвязда»—у калгасы у польласьці 50.000

Зьмест лістоўкі: пастановы ЦВК і СНК СССР, якія крукуюцца ня ў нашай газэце, аб мерах садзейнічаньня для пашырэньня плошчы севу ў індывідуальных гаспадарках, пастанова ЦВК СССР аб пашырэньні таварыствы па супольнай апрацоўцы зямлі і іх членаў ільгот, якія ноўлены законам ад 2-га красавіка 1930 г., і пастанова НКЗ СС Калгасцэнтру па пытаньні аб ажыцьцяўленьні пастановы аднога статуту арцелі.

Ня спыняць прыёму ў калгасы

БЕЛКАЛГАСЦЭНТР УЧОРА РАЗАСЛАЎ УСІМ АКРУГОВЫМ І Р НЫМ КАЛГАССАЮЗАМ, А ТАКСАМА І ПРАЎЛЕНЬНЯМ КАЛГАСАЎ ТЭ РАМУ, У ЯКОЙ КАТЭГАРЫЧНА ПРАПАНУЕЦЦА НЕ У ЯКІМ ВЫПАДКУ СПЫНЯЦЬ З ПРЫЧЫНЫ СЯЎБЫ ПРЫЁМУ ЖАДАЮЧЫХ УСТУПІЦ КАЛГАСЫ.

Безадкладна правесьці ў жыцьцё

Ва ўчарайшым нумары «Зьвязды» апублікавана пастанова ЦК УсеКП(б) аб кіраўніцтве прамысловымі прадпрыемствамі. Гэта пастанова мае вялізарнае значэньне і для БССР. Недахопы, адзначаныя ЦК у адносінах да мэталяпрамысловасьці, у асноўным характэрны для большасьці беларускіх прадпрыемстваў.

Вынікі першага паўгодзьдзя работы беларускае прамысловасьці нездавальняючыя. Ня гледзячы на вельмі вялікі эрэ кіраўніцтвы з мінулым годам, беларуская прамысловасьць ня выканала плянавых заданьняў. За кастрычнік —люты прадукцыя выраслa на 69,4 процанты замест 77 проц. Яшчэ горш з якаснымі паказальнікамі. Сабекошт зьніжаны толькі на 6,6 проц. супроць 11 проц. па пляне.

Аднэй з прычын гэтых зрываў у рабоце прамысловасьці зьяўляюцца буйныя недахопы ў кіраўніцтве прадпрыемствамі. Катэгарычная дырэктыва ЦК УсеКП(б) аб адзіначальні ад 5 верасьня 1929 г. на беларускіх прадпрыемствах, за рэдкімі выключэньнямі, не праведзена ў жыцьцё. Дырэктары яшчэ ня сталі сапраўднымі кіраўнікамі прадпрыемстваў. Яшчэ часты ўмешваньні партыйных і прафсыянальных арганізацый у апэрацыйныя распараджэньні адміністрацыі. Яшчэ ня зжыты пробы адміністрацыйнага пэрсаналу ўзвальваць адказнасьць, хавацца за сьпіну заўкому і ячэйкі. Яшчэ няма зруху ў падборы цьвёрдых кіраўнічых кадраў у цэху. Яшчэ ў некаторых мясцох надзвычай слабая барацьба за жалезную пралетарскую дысцыпліну.

Матар'ялы, якія друкаваліся ў апошні час у «Зьвязьдзе», даюць выразныя ўзоры парушэньня прынцыпу адзіначальля на нашых прадпрыемствах.

На заводзе «Камунар» старшыня заўкому самавольна зьняў з працы рабочых і паслаў іх у вёску. Дырэктар заводу толькі праз два дні даведаўся аб гэтым. Прыклад заўкому аказаўся заразьлівым. Нават савет фізкультуры, без дазволу дырэктара, адаслаў у вёску двух рабочых.

Цікава адзначыць, што гэты-ж заўком, які ўмяшваўся ў функцыі адміністрацыі, ня выконвае сваіх простых абавязкаў. Рвачом, якія выклікаюць сваімі ўчынкамі абурэньне асноўнага здаровага ядра рабочых, не даецца ніякага адпору. Наадварот, быў выпадак актыўнага процідзейнічаньня заводакіраўніцтву, якое звольніла шкодніка за тое, што ён наўмысьля павялічыў бран.

Практыка заводу «Камунар» характэрна і для іншых нашых прадпрыемстваў. Яна сьведчыць, што важнасьць безадкладнага правядзеньня прынцыпаў адзіначальля яшчэ не ўсьвядомлена многімі нашымі арганізацыямі. Яна сыгналізуе аб неабходнасьці безадкладнага пералому на гэтым вучастку нашай работы.

Рэзалюцыя ЦК УсеКП(б) ад 10 красавіка патрабуе жорсткай барацьбы з неразьбярыхай у кіраўніцтве прамысловымі прадпрыемствамі. ЦК прапануе «рашуча зжыць факты ўмешваньняў партыйных і прафсыянальных арганізацый у апэрацыйныя распараджэньні адміністрацыі прадпрыемства і цэхаў і поўнасьцю забясьпечыць за дырэктарамі і начальнікамі цэхаў права самастойнага назначэньня і перамяшчэньня адміністрацыйна - тэхнічнага пэрсаналу».

Дырэктары павінны быць ня толькі агульнымі кіраўнікамі прадпрыемстваў. Яны абавязаны аўладаць тэхнікай вытворчасьці, кіраваць ёю. А для гэтага неабходна ўзьняць тэхнічны ўзровень кіраўнічых кадраў нашай прамысловасьці. ЦК паказвае рад канкрэтных мер у гэтым напрамку. Побач з узмацненьнем перападрыхтоўкі дырэктароў і начальнікаў цэхаў патрэбна «больш сьмелае выпучэньне на адказную кіраўнічую работу ў прадпрыемствах як партыйных, так і адданых справе савецкай улады беспартыйных рабочых, майстроў, тэхнікаў, якія адзначаюцца сваімі ведамі вытворчасьці і адміністрацыйна - арганізатарскімі ямі».

Наогул падбору кіраўнічых работнікаў для прадпрыемстваў у рэзалюцыі Цэнтральнага Камітэту аддаецца вельмі многа ўвагі. Ад вырашэньня гэтага пытаньня залежыць пасьпяховасьць нашай барацьбы за выкананьне пяцігадовага пляну вялікіх работ. Барацьба за тэхнічна падрыхтаваныя кадры павінна весьціся больш упарта, больш настойліва і сыстэматычна, чым да гэтага часу.

Побач з выпучэньнем на кіраўнічую работу рабочых і тэхнікаў, якія ўладаюць тэхнічным вопытам і ведамі, нельга выпускаць з-пад увагі правільнае скарыстаньне спэцыялістых. Вядучы барацьбу, выкрываючы шкодніцкія элемэнты, трэба рашуча павесьці работу па палітычным перавыхаваньні асноўнай масы спэцыялістых, па набліжэньні іх да партыі і рабочае клясы. «Савецкія спэцыялістыя павінны мець упэўненасьць у падтрыманьні пры правядзеньні імі патрэбных мерапрыемстваў, якія забясьпечваюць правільную арганізацыю працы і вытворчасьці».

Новая пастанова ЦК — важны палітычны дакумант. Патрэбна шырокая папулярызацыя яе сярод рабочых. Патрэбна безадкладнае правядзеньне яе ў жыцьцё.

ПАСТАНОВА ЦВК СССР

аб пашырэньні на таварыствы па супольнай апрацоўцы зямлі і іх членаў ільгот, устаноўленых законам ад 2 красавіка 1930 г.

У сувязі з запытаньнямі раду мясцовых саветаў і калгасаў, прэзыдыум ЦВК СССР растлумачвае:

1) Ільготы для калгасаў і іх членаў, устаноўленыя пастановаю ЦВК і СНК СССР ад 2-га красавіка 1930 г., цалкам пашыраюцца толькі на сельска-гаспадарчыя арцелі, камуны і таварыствы па супольнай апрацоўцы зямлі, у якіх рабочая скаціна і інвэнтар абагулены.

2) На таварыствы па супольнай апрацоўцы зямлі, у якіх рабочая скаціна і інвэнтар не абагулены, не пашыраюцца ільготы, прадугледжаныя ў арт. арт. 4 (аб 500 мік. крэдыце) і 5 (аб растэрмінаваньні спагнаньня запазычанасьці па крэдытах) закону ад 2 красавіка 1930 г.

3) Ільготы, паказаныя ў п. «д» арт. 1 (якія датычаць абкладаньня кароў, дробнае скаціны і птушкі) пашыраюцца па таварыствы, паказаныя ў пункце 2-ім гэтае пастановы ў палавінным разьмеры на тэрміны, паказаныя ў законе ад 2 красавіка 1930 г.

4) Ва ўсім іншым, закон ЦВК і СНК СССР ад 2 красавіка 1930 году адпаведна пашыраецца і на таварыствы па супольнай апрацоўцы зямлі, паказаныя ў арт. 2 гэтае пастановы.

5) Скасаваць: а) растлумачэньне Наркамфіну СССР, апублікаванае 1-га красавіка 1930 г., аб вызваленьні ад адзінага сельска-гаспадарчага падатку тэрмінам на 5 год новых саўгасаў; б) цыркуляр саюзу саюзаў сельска-гаспадарчай каапэрацыі, Калгасцэнтру і Птушкаводсаюзу ад 12 красавіка 1930 году.

Старшыня ЦВК СССР КАЛІНІН.
Сакратар ЦВК СССР ЕНУКІДЗЗ.
Масква, Крэмль. 12 красавіка 1930 году.

Скарыстаць усе магчымасьці

для пасьпяховага правядзеньня сплав

У гэтым годзе мы ў БССР у сплаўнай кампаніі сутыкнуліся з надзвычайным, можна сказаць, нябывалым памяльчэньнем рэк — вынік бясьсьнежнай зімы. Гэтае зьявішча прыводзіць да таго, што сплаў ідзе надзвычай марудна ча чарапашыным крокам.

Гэтыя стыхійныя цяжкасьці трэба перамагчы напруджанай і максымальна выразнай работай.

На справе-ж мы бачым, што сплаўная работа не пастаўлена на баявую нагу.

Узяць хаця-б той факт, што плытагоны надзвычай кепска забясьпечваюцца каапэрацыйнай прадуктамі і спэцвопраткай.

Сплаў таксама не забясьпечаны поўнасьцю рабочай сілаю, за выключэнем, хіба, Полацкага раёну, дзе касьцю плытагонаў даходзіць да 1 чалавек — у тым ліку каля 25 жанчын (мы ў гэтым годзе ўпяр бачым жанчын у ролі плытагонак), фэсыянальныя арганізацыі (асаз саюз сельсакрабочых) мала ўдзялялі пытаньням забесьпеч сплаву рабсілаю.

Органы Наркомлесу на мясцох так аказаліся не на вышыні — аб гэты ворань такія факты, як перамаш не рабочых адзін у другога, няцьв веданьне вызначанай для сплаву касьці лесаматар'ялу. Як, калі ня вацінствам, можна назваць такі калі Мазырскае аддзяленьне Лес зрабіла рашучу на сплаў 25.000 мэтраў, а праз дзень зьніжала гэту ку да 9.000 куб. мэтраў.

Пры такім сур'ёзным станов калі певыкананьне сплаву ставіц пагрозу выкананьню экспартнага п і можа прывесьці да перабоюў у це нашых лесапільных заводаў, мы вінны ўжо сьцяць за кожным кам сплаўных кампаній. Нам неаб ў максымальнай ступені фаго сплаўную сілу. Прафсаюзам бу коў і грамадзкарганізацыям — тым а якія непасрэдна зацікаўлены ў ус совым арганізаваньні лесаматар'я абходзіць лучыць далатны брыгады для накіраванн ныя сплаўныя пункты. ное знач ло-б краю ... мін, калі кампаній.

ІІМАЎ.

...ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ ...ТАВАЛІ ў АНГЛІІ

...і настрой рабочых

...кай ваўнянай ... забастоўка. ...абочых ваўняных фабрык і ўплыў якой сярод рабочых ваўнянай прамысловасьці расьце. ...то гэтымі дня... Але гэта згодніцкае ўстрыманьне тлумачыцца толькі іх разьлікамі, што рост ...а і іншыя ра... камуністычнага ўплыву і наогул абвастрэньне забастовачнай барацьбы будзе ...овасьці. спынена паліцэйскімі мерапрыемствамі.

Паліцыя сапраўды разгортвае нячуваную актыўнасьць у раёнах ваўнянай прамысловасьці. Усе раёны напоўнены моцнымі паліцэйскімі атрадамі, якія прабуюць не дапускаць сходаў і мітынгаў, што склікаюцца кампартыяй і камітэтамі дзеяньня (якія арганізаваны па цяперашнім кампарты).

У Брэдфордзе (цэнтр ваўнянай прамысловасьці) паліцыя абвясьціла забароненым мітынг, скліканы камітэтам дзеяньня каля аднэй з фабрык. Тады арганізатары мітынгу перанялі яго ў мясцовы грамадзкі парк. У парку паліцыя зноў прабавала разагнаць сабраўшыхся рабочых. Аднак, сустрэла з іх боку рашучае супраціўленьне. Удзельнікі мітынгу бамбардавалі паліцэйскіх каменьнямі і крэсламі. Пяць рабочых былі арыштаваны.

...КА У ПОУНЫМ РАЗГАРЫ

...ю-кратыцы сарваць

...ндэнт ТАСС ...ў паездку ў ...овасьці. Усю... разгары. Тольк... ...куюць штрэйк... ...торых прад... ...ставіць на ра... ...нак, масавыя ...ікам у 3.000 ...ы, работніц, за... ...ы штрэйкбрэ... ...ыўся рад су... ...анены адзін ...два штрэйк... ...хар кінуты ў ...цьба вядзец... ...ю, пры чым ...ыя паводзі... ...умовах, высу... ...рацуюць нека... ...кі ў асобных ...ы частко... ...ратыі ... ...стоўку і заяў... ...ці заключыць ...ю згоду тэрмі... ...нове скара... ...проц. Нека... ...ноць гэту пра...

...ўры ў Брэд... ...ы выпусьціў ...і заяўляе, што ...ацоць забасто...

...ўмовах разгортван... ...ы клясавай ...ацьбы, ва ўмовах ка... ...ыталістычнага ...ужэньня і падрыхтоўкі нападу імпэрыялістых на СССР, — выкананьне ...мфінпляну мае выключнае гаспадарчае-палітычнае значэньне. Ліст беласкіх рабочых выразна гаворыць аб ...м, што кожны прарыў у прамфінпляне ...апрача ўсяго іншага прыносіць шкоду рэвалюцыйнай барацьбе ва ўсім ...це.

...ав. Васкабойнікаў спыняецца на пра... ...ах у выкананьні прамфінпляну за ...шыя пяць месяцаў бягучага гаспа... ...чага году. За гэтыя 5 месяцаў пра... ...ловасьць БССР недавыпрацавала ...00 плугоў, 700 сячкарань, 600.000 ...раў тканіны, 100.000 пар абутку і ...00 скрынак запалак.

...найбольш дрэнныя паказальнікі дае ...алёвая прамысловасьць, якая выка... ...а толькі 86,9 проц. заданьня, шкля... — 92 проц., ільна-традзільная — ...проц., папяровая — 81 проц. і абут... ...ая — 83 проц.

...а першыя 5 месяцаў Віцебскі завод ...рвоны Мэталісты» выканаў толькі ...проц. заданьня; Віцебская гарбарня ...толькі 81 проц. праграмы, завод ...ўка» — 83 проц.

...ірэктывы аб зьніжэньні сабекошту ...дукцыі ў жыцьцё не праведзены. ...і прамысловасьць БССР недавыканала ...амаль што 4 з паловай проц. заданьня, якія былі пастаўлены прамфінпля...

...се даныя гаворыць аб тым, што ня... ...ніяких аб'ектыўных прычын для не... ...каньня прамфінпляну. Асноўныя ...чыны суб'ектыўныя.

...Наш гаспадарчы апарат, нашы адміністрацыйна-тэхнічныя кіраўнікі не ...істасавалі сваёй работы да ажыцьцяўленьня вызначаных тэмпаў. Ёсьць ...і галін прамысловасьці, якія не ...цьцёмні асноўных дырэктыў аб пе...годзе прад... ...ыстаў ...а самастойны ...падарчы разрахунак.

...Абутковыя фабрыкі ў Менску і Ві...ску дагэтуль працуюць не паводзе ...тэмы закаў ... і нарадаў.

...дзе выкананьне дырэктывы аб ...інаначальні? Ці многа ёсьць у нас ...ікаў, якія могуць сьмела ...заць, што ...апраўды стаяць на ча... ...прадпрыемству, што яны выканалі ...рэктыву аб ...інаначальні. Такіх гас... ...арнікаў у нас адзінкі. Затое ў нас ...ць шмат прадпрыемстваў, якія ...мкнуцца ...аніць адказнасьць на другія плечы.

...масы рад ...ыпадкаў няправільнай ...ной арыентацыі рабочых арганізацый на пытаньні вытворчых магчымасьцяй прадпрыемстваў. Некаторыя ...ыдарнікі (Віцебскі «Чырвоны Мэталісты», Гомельскі «Пралетары») давалі ...очым арганізацыям, рабочым брыгадам, рэдакцыям шматтыражак хлусьня весткі аб тым, што, з прычыны ...ахвату сырцу, нельга выканаць ...мфінплян, і дабіваліся таго, што ра... ...ыя прыяжджалі ў ВСНГВ і патрабалі сырцу, што шматтыражкі начали ...трывогу — біццам, прамфінпляні ...ваецца з-за аб'ектыўных прычын.

...ЗЕНЬНІК КАНФЭРЭНЦЫІ

...Другарнцай канфэрэнцыі заслухана ...КУРЦІКА аб удзеле за... ...выкананьні прамфін...

...ка ...ава і Курціка.

...ка ...ка ...ка

ЛІСТОК РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ ІНСПЭКЦЫІ

ПАЧЫНАЕМ АГЛЯД ПРАЦЫ БЕЛКААПСАЮЗУ

Апарат Белкаапсаюзу не перабудаваўся для выкананьня важнейшых задач, якія стаяць перад штабам сацыялістычнай каапэрацыі

БЯЗЛАДЗЬДЗЕ Ў СТРУКТУРЫ, БЛЫТАНІНА І ПАРАЛЕЛІЗМ, ФАКТЫ БЮРАКРАТЫЗМУ І СКАЖЭНЬНЯ КЛЯСАВАЙ ЛІНІІ

ВАЖНЕЙШЫЯ ДЫРЭКТЫВЫ ПАРТЫІ: аб рабочым забесьпячэньні, абслугоўваньні калгасаў і саўгасаў, забесьпячэньні сплаўных работ і лесазагатовак, аб разгортваньні грамадзкага харчаваньня, аб каапэраваньні беднаты і батрацтва—ВЫКОНВАЮЦЦА ВЕЛЬМІ МАРУДНА

За баявы штаб сацыялістычнай каапэрацыі

Камісія па чыстцы Белкаапсаюзу і рабочыя брыгады дасканала яшчэ не азнаёміліся з структурай і зьместам працы Белкаапсаюзу. У сучасны момант рабочымі брыгадамі праводзіцца абсьледваньне працы цэнтральнага апарату і 2-х акруговых — у Гомелі і Полацку. Але тыя матар'ялы, якія ўжо ёсьць у нашым распараджэньні, выразна паказваюць, што мы маем НЯРУХОМЫ І ЗУСІМ НЕПРЫСТАСАВАНЫ ДА СУЧАСНЫХ ЗАДАЧ І ТЭМПАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ ГРАМОЗДКІ АПАРАТ У ЦЭНТРЫ І Ў АКРУГАХ. Неабходнасьць карэннай рэарганізацыі апарату—рэч бясспрэчная. Досыць падаць наступныя лічбы: у апараце Белкаапсаюзу (толькі ў цэнтры—акрамя кантор і аддзяленьняў) ёсьць: 1 кіраўніцтва, 9 аддзелаў, 2 часткі і 23 групы, у якіх працуе КАЛЯ 200 ПРАЦАЎНІКОЎ.

Што асабліва трэба падкрэсьліць у працы Белкаапсаюзу — гэта нячуваны паралелізм і блытаніну ў функцыях аддзелаў.

Напрыклад, да апошняга часу ў Белкаапсаюзе апэрацыйныя кіраўніцтвы займаліся тэхнікай арганізацыі работы, а «клясавасьць» вырашалася ў арг. аддзеле. Такім чынам, разьмеркаваньне тавару праводзілася ў апэрацыйных групах, а прынцыпы разьмеркаваньня, «клясавы рэцэпт» прапрацоўваўся ў арг. аддзеле.

Або другі прыклад: арганізацыйна-інструктарская работай займаецца аргаддзел (дзе ёсьць спэцыяльны штат інструктароў), Белрабсэкцыя (па лініі раб. каапэрацыі) і акрамя гэтага ёсьць яшчэ розныя інструктары ў аддзелах і групах. А ў выніку... ніякага інструктаваньня месцамі.

Ёсьць спэцыяльны фінансавы аддзел (акрамя бухгальтэрыі), які павінен займацца фінансавай палітыкай, між тым, пытаньнем паявых накапленьняў ведае аргаддзел.

Затое адных толькі кансультантаў, інструктароў і эканамістых у Белкаапсаюзе БОЛЬШ ЗА 60 ЧАЛАВЕК. Ёсьць «спэцы» па розных відах тавару, якія ў значнай частцы сядзяць і займаюцца пісаніной, перапісваньнем розных абежнікаў, АЛЕ ФАКТЫЧНАГА КІРАВАНЬНЯ МЕСЦАМІ НЯМА.

Рад важнейшых пытаньняў—па рабочым забесьпячэньні, па абслугоўваньні калгасаў і саўгасаў, па абслугоўваньні сэзоннікаў, па рабоце сярод беднаты і батрацтва—пастаўлены вельмі дрэнна.

Ужо выяўлена шмат фактаў цяганіны і бюракратызму з боку асобных работнікаў, дрэнная пастаноўка, а ў некаторых выпадках НЕДАПУШЧАЛЬНАЯ НЯДБАЙНАСЬЦЬ па загатоўцы асобных тавараў (грыбы, рызьзё, фрукты і г. д.).

Зварачае на сябе ўвагу вялізарнейшы апарат бухгальтэрыі—КАЛЯ 40 ЧАЛАВЕК.

Першыя ўражаньні, якія мы атрымалі ў сувязі з працай рабочых брыгад, такія: ЗАМЕСТ ГІБКАГА І БАЯВОГА ШТАБУ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ КААПЭРАЦЫІ, МЫ МАЕМ ГРАМОЗДКІ, АДСТАЛЫ АД ЖЫЦЬЦЯ І ПАГРУЖАНЫ Ў СТАРЫЯ КААПЭРАЦЫЙНЫЯ ТРАДЫЦЫІ, БЮРАКРАТЫЧНЫ МЭХАНІЗМ.

Задача рабочых брыгад — дапамагчы стварыць сапраўды баявы штаб сацыялістычнай каапэрацыі.

Л. ЭПШТЭЙН.

Самакрытыка ў Белкаапсаюзе



Як рабочая брыгада „цягне за язык".

Белкаапсаюз „тварам" да калгасу

Аб добрых пастановах і... дрэнных выканаўцах

«У адносінах абслугоўваньня калгасьнікаў, улічваючы **шпаркі тэмп** калектывізацыі сельскай гаспадаркі і дырэктывы апошняй сэсіі ЦВК, намі распрацоўваецца палажэньне аб парадку іх абслугоўваньня ва ўсіх галінах, якое ў бліжэйшыя 5-10 дзён будзе вам выслана».

Так пісала праўленьне Белкаапсаюзу 29 лістапада 29 г., за подпісам тав. **Балціна**, усёй сыстэме спажывецкай каапэрацыі па пытаньні аб важнасьці абслугоўваньня аграмаджанага сэктару.

Прайшло 5 дзён, прайшло **5 месяцаў**, але-ж і да гэтага часу палажэньня, што абяцаў Белкаапсаюз, яшчэ няма.

Белкаапсаюзаўцы з абурэньнем сустракаюць кожнага, які адважыцца абвінавачваць іх у тым, што па абслугоўваньні калгасьнікаў і саўгасьнікаў імі нічога ня зроблена. «Як-жа, мы яшчэ ў лістападзе па пасяджэньні праўленьня прынялі больш за 20 пастаноў па гэтым пытаньні, а вы кажаце»...

Вось разгледзім, якія пастановы прымаў Белкаапсаюз і як ён іх выконваў.

1-я пастанова: «Прапанаваць апэрацыйнаму кіраўніцтву разам з аргаддзелам і плянава-статыстычным аддзелам у 2-хтыднёвы тэрмін распрацаваць палажэньне аб забесьпячэньні саўгасаў таварамі».

Нічога сабе тэмпы — **2 тыдні** на распрацоўку пытаньня аб забесьпячэньні саўгасаў. Але праўленьне Белкаапсаюзу лепш, як мы, ведае сваіх супрацоўнікаў, якія заўсёды працуюць у «поўнай» адпаведнасьці з агульнымі тэмпамі разьвіцьця сацыялістычнага будаўніцтва. Гэта пастанова была вынесена ў лістападзе 1929 г., а ў красавіку 1930 г. пастанова яшчэ ня выканана. Толькі 30-га сакавіка праўленьне Белкаапсаюзу «тэрмінова» накіравала адбітак інструкцыі Цэнтрасаюзу — «да ведама і кіраўніцтва».

2-я пастанова: «Прапанаваць выторча-будаўнічаму аддзелу ў 3-хтыднёвы тэрмін сумесна з Белсельтрэстам і Калгасцэнтрам распрацаваць сыстэму мерапрыемстваў па грамадзкім харчаваньні і хлебапячэньні ў саўгасах і калгасах».

Пытаньне грамадзкага харчаваньня

ЭПШТЭЙН — адзін з многіх кансультантаў Белкаапсаюзу. Шмат гаворыць, а карысьці мала. Вельмі пагардна адносіцца да загатоўкі другарадных відаў сырцу. Сарваў плян загатоўкі касьцей, пому і інш. Плян забесьпячэньня посазагатовак прадуктамі прыняў «да ведама».

у «поўнай» адпаведнасьці з агульнымі тэмпамі разьвіцьця сацыялістычнага будаўніцтва. Гэта пастанова была вынесена ў лістападзе 1929 г., а ў красавіку 1930 г. пастанова яшчэ ня выканана. Толькі 30-га сакавіка праўленьне Белкаапсаюзу «тэрмінова» накіравала адбітак інструкцыі Цэнтрасаюзу — «да ведама і кіраўніцтва».

2-я пастанова: «Прапанаваць выторча-будаўнічаму аддзелу ў 3-хтыднёвы тэрмін сумесна з Белсельтрэстам і Калгасцэнтрам распрацаваць сыстэму мерапрыемстваў па грамадзкім харчаваньні і хлебапячэньні ў саўгасах і калгасах».

3-я пастанова: «Прапанаваць культаддзелу ў 2-хтыднёвы тэрмін распрацаваць сумесна з Белсельтрэстам і Калгасцэнтрам тыповыя згоды аб арганізацыі і правядзеньні бытавых мерапрыемстваў у саўгасах і калгасах».

Добрая пастанова: пасьля атрыманьня калгасьнікамі прамтавараў, пасьля добрага сьнеданьня і абеду ў калгаснай сталоўцы яны будуць карыстацца культурна-бытавымі ачагамі Белкаапсаюзу на вёсцы.

Але што здарылася? Мы ў Гомелі шукалі гэтых «тыповых згод аб арганізацыі і правядзеньні бытавых мерапрыемстваў у саўгасах і калгасах», якія мелі быць распрацаваны яшчэ ў лістападзе 1929 г., але, на жаль, іх не знайшлі. Нам па тэлефону з Менску паведамілі, што яны яшчэ «распрацоўваюцца». Магчыма, праз 2 тыдні будзе яшчэ адна пастанова Белкаапсаюзу, якая пачнецца: «у сувязі са шпаркімі тэмпамі...» аб неабходнасьці і г. д.».

ВЕРГУР.

Што павінна даць чыстка Белкаапсаюзу

Чыстка Белкаапсаюзу павінна мабілізаваць увагу ўсіх работнікаў апарату спажывецкай каапэрацыі БССР. Трэба аказаць максымальную дапамогу камісіі па чыстцы апарату Белкаапсаюзу, выявіць усе недахопы.

Побач са значнымі дасягненьнямі, якія бязумоўна ёсьць у рабоце цэнтральнага апарату Белкаапсаюзу, трэба адзначыць і вялікую колькасьць недахопаў.

ПЕРШЫ НЕДАХОП — Белкаапсаюз яшчэ поўнасьцю не перабудаваўся ў адпаведнасьці з цэлым радам новых задач, якія стаяць перад спажывецкай каапэрацыяй. Гэта тлумачыцца, галоўным чынам, тым, што апарат уларта чапляецца за старыя формы і мэтады работы, што асобныя работнікі імкнуцца вырашаць вельмі сур'ёзныя пытаньні бюракратычным мэтадам, а адсюль боязьнь новых мэтадаў работы, што адбіваецца і вельмі моцна на ўсім апараце ў цэлым.

ДРУГІ НЕДАХОП — адсутнасьць патрэбнай выразнасьці і хуткасьці ў выкананьні заданьняў. Таму вельмі часта вырашэньне важных пытаньняў, зьвязаных з вялізарнымі палітычнымі і гаспадарчымі задачамі нашага краю, зацягваецца.

ТРЭЦІ НЕДАХОП — кепскаватая якасьць абслугоўваньня працоўных мас. Рад труднасьцяй аб'ектыўнага парадку ў забесьпячэньні працоўных прамтаварамі і прадуктамі харчаваньня (значнае павялічэньне попыту ў сувязі з ростам матар'яльнага становішча насельніцтва) часта павялічваецца па віне апарату каапэрацыі.

ЧАЦЬВЕРТЫ НЕДАХОП — гэта выпадкі скрыўленьня клясавай лініі, наяўнасьць правага ўхілу на практыцы ў рабоце асобных частак апарату. Асабліва гэта дае сябе адчуваць у пытаньні каапэраваньня, паянакапленьня і абслугоўваньня паасобных сацыяльных груп насельніцтва.

ПЯТЫ НЕДАХОП — усё яшчэ слабое выпучэньне рабочых у апарат, слабое яго арабочаньне.

Усе гэтыя і іншыя недахопы (іх бязумоўна больш) у выніку чыстці павінны быць зьнішчаны. Чыстка павінна выявіць мяжу недахопаў аб'ектыўнага парадку, паказаўшы, дзе пачынаюцца недахопы па віне апарату, кіраўніцтва і асобных работнікаў. Асабліва значэньне таму мае падрыхтоўчая работа да чыстці, якая цяпер праводзіцца рабочымі брыгадамі. Вядома, шмат залежыць ад таго—наколькі з боку ўсяго апарату і асобных яго работнікаў будзе аказана сапраўдная патрэбная дапамога рабочаму брыгадзіру. Трэба падкрэсьліць, што ёсьць ужо выпадкі, калі асобныя працаўнікі, замест правільнага паступленьня рабочым брыгадзірам асобных пытаньняў, пачынаюць зваліваць адзін на аднаго віну і гэтым самым дэзарганізуюць рабочага брыгадзіра.

Максымум дапамогі рабочым брыгадзірам і камісіі па чыстцы.

Т. ХАСКІН.

АД РЭДАКЦЫІ: Даючы месца артыкулу т. Хаскіна, рэдакцыя чакае ў бліжэйшыя-ж дні ад т. Хаскіна КАНКРЭТНЫХ І ФАКТЫЧНЫХ матар'ялаў аб адзначаных ім недахопах.

„Апарат" Белкаапсаюзу

Кансультант на кансультанце сядзіць...

Недаацэнка важнейшай справы

Нуль увагі рабоце сярод батрацтва і беднаты

Няма патрэбы сёньня даводзіць вялікай важнасьці арганізацыі працы сярод батрацтва і беднаты, бо большмені сьвядомы грамадзянін ведае, што пэрыяд жорсткай клясавай барацьбы па вёсцы патрабуе поўнай згуртаванасьці батрацка - бяднацкіх мас.

Як-жа праводзіць гэту работу Белкаапсаюз?

Дрэнна! Каапэраваньне батрацтва і беднаты праходзіць бяз усякай плянавасьці — саманёкам. Яшчэ да гэтага часу большасьць акрспажсаюзаў ня склалі плянаў поўнага каапэраваньня батрацтва і беднаты на 1929-30 г. Ні адзін саюз, у тым ліку і Белкаапсаюз,

ГОРДЗІН — «спэц» па садавіне, сам былы гандляр і падабраў сабе хэўру ўпоўнаважаных — такіх-жа былых гандляроў, як і сам. Яшчэ ў гэтым годзе закуплена ў прыватнікаў рознай садавіны на 14.000 руб.

ня ведае, колькі батракоў каапэравана і колькі яшчэ застаецца некаапэраваных. Скарыстаньне фонду каапэраваньня беднаты далёка нездавальняючае. Ёсьць рад момантаў яўнага скрыўленьня клясавай лініі. Выдаецца пазычкі заможнай частцы серадняцтва да гэтага часу большасьцю спаж. таварыстваў не спагнаны. Яшчэ на сёньняшні дзень у значнай частцы таварыстваў групы батрацтва і беднаты не арганізаваны.

Усё гэта тлумачыцца тым, што пытаньне арганізацыі працы з батрацтвам і беднатою не стаяла ў рабоце Белкаапсаюзу, як асноўнае пытаньне. Да гэтага часу ў некаторых саюзах няма працаўнікоў з батрацтвам і беднатой. Нічога дзіўнага, калі ў самым апараце Белкаапсаюзу да сёньняшняга дня няма працаўніка па працы з батрацтвам і беднатою. Белкаапсаюз замест падшуканьня працаўніка на гэту работу займаецца «очковтирательством»: у часе наведваньня інструктара Цэнтрасаюзу, інструктару БКС па масавай працы даручылі і працу з батрацтвам і беднатой. Як быццам пытаньне вырашана. А фактычна гэтай працай займаюцца «ўсе», а гэта значыць — ніхто. У чым справа? Мо' гэта здарылася таму, што мы перажываем труднасьці з кадрамі? Не, гэта ня так. Прасачыўшы рух апарату Белкаапсаюзу за апошнія 3-4 месяцы, можна ўбачыць, што за гэты кароткі тэрмін прынята ня менш 60-70 новых працаўнікоў, у тым ліку і членаў партыі. І што-ж, наколькі праца з батрацтвам і беднатою «малаважная», парашылі ўкамплектаваць гэты апарат у апошнюю чаргу. Наогул праца з батрацтвам і беднатою ў Белкаапсаюзе знаходзіцца ў вялікім запяпадзе. Ёсьць пэўная недаацэнка гэтае працы. Нават на пасяджэньні праўленьня за апошні год ні разу не стаяла пытаньне аб працы з беднатой.

Такая недаацэнка працы з батрацтвам і беднатою, кепскі стан гэтае працы зьяўляецца нічым іншым, як правай практыкай у працы Белкаапсаюзу.

В—ын.

БЭРМАН — кансультант па прамтаварах. Па бюракратызьме пабівала ўсякія рэкорды. Свайму падначаленаму, які сядзіць побач, піша службовую запіску — «Прашу пагутарыць са мной».

Камбінацыі загатоўшчыкаў

Загатоўшчыкі Белкаапсаюзу пад выглядам павялічэньня загатовак пушнины і сырцу на працягу раду год сыстэматычна парушалі канвэнцыйныя цэны, вызначаныя Наркамгандлем Беларусі, сельгаскаапэрацыяй і іншымі загатоўшчыкамі. Усе яны пераплацілі сотні тысяч рублёў дзяржаўных грошай. Гэта вяло да зрыву загатовак і парушэньня экспартных плянаў, да падрыву эканамічнай палітыкі савецкае улады на вёсцы.

Прадстаўнікі Белкаапсаюзу разьяжджалі па вясковых каапэратывах і агітавалі: «загатаўляйце, не глядзеце на канвэнцыйныя цэны, плацеце, колькі просяць» (спэц. **Аўрух** з Гомельскае базы БКС).

Як яны ўтойвалі гэтыя пераплаты?

Каб утаіць свае злачынствы, загатоўшчыкі пры прыёмцы ніжэйшыя гатункі сырцу запісвалі і аплачвалі, як вышэйшыя. Такім чынам, напрыклад, па Гомельскай грыбной базе БКС вышэйшых гатункаў запісана на прыход 73 проц. агульнае колькасьці, а пры сапраўдным іх сартаваньні і адгрузцы гэтых-жа гатункаў аказалася ўсяго толькі 31 проц., рэшта 42 проц. — проста жаўцякі і брак. Другі спосаб утойваньня пераплат — усялякія фокусы пры перапрацоўцы; складаньне фіктыўных актаў аб адыходзе браку, якога ў сапраўднасьці на было, запісваньне на прыход сырцу, які ў сапраўднасьці зусім не паступаў, складаньне падробленых дакумантаў і г. д.

Напрыклад па Барысаўскай базе БКС не хапіла 50 пудоў грыбоў, якія фактычна туды ніколі не паступалі.

Усё гэта рабілася пад непасрэдным кіраўніцтвам загадчыка базы Ігнатовіча, які ўсім гаварыў: «ня бойцеся, я за ўсё адказваю».

Што зрабіў Белкаапсаюз, як ён змагаўся з гэтымі злачынствамі?

Белкаапсаюз маўкліва падштурхваў сыстэму да пераплат. Ён усімі спосабамі абараняў у НКГандлі спажывецкабамі абараняў у НКГандлі спажывецкабамі абараняў, калі НКГандлю накладваў штрафы за пераплаты БКС ні разу не пасылаў на свае базы адказных асоб праверыць правільнасьць вядзеньня загатовак.

Што паказаў, напрыклад, суд над барысаўскімі каапэратарамі?

Суд паказаў поўнае разлажэньне ўсяго апарату, сувязь з прыватнікамі і захоўваньне іх ад падатка. Суд выкрыў, што аб усім гэтым ведаў Белкаапсаюз і ня толькі ведаў, а штурхаў на злачынствы, абяцаючы ўзнагароды за добрыя вынікі.

Цьвёрдага кіраўніцтва ў загатоўках з боку БКС сыстэма не адчувала, у выніку чаго кожная акруга працавала па свойму. Напрыклад, БКС прадаў дзесяткі вагонаў журавін па Урал, у Данбас і інш. Прадавалі яе і самі акругі. Ніякага пляну загатоўкі журавін мясцом ня было дана і ў выніку — ніводнага дагавору БКС ня выканаў. Дагавор на загатоўку скуры для Скуртрэсту таксама ня выкананы.

Наогул дырэктывы мясцом зусім не даваліся, або даваліся са значным спазьненьнем. Напрыклад: саюзы і аддзяленьні (Полацак) толькі ў канцы сакавіка ставяць пытаньне аб канцрактацыі цілят, калі большая частка кароў ужо ацяліліся і цілята забіты. Гэтае спазьненьне роўназначна зрыву кантрактацыі цілят.

Кансультант БКС Эпштэйн лічыць, што загатоўкай касьцей ён можа зусім ня цікавіцца, і на запытаньне, чаму ў гарадох не арганізавана збораа касьцей, ён адказвае: «у мяне былі больш важныя справы». Трымаючыся такога погляду, ён пэны на косьці да вырсаюзу давёў са спазьненьнем, наадгрузку касьцей давалася несвайчасова, адказы на запытаньні саюзу затрымліваліся на 15 дзён. Праўленьне БКС і НКГандлю на гэту справу таксама ўвагі не зварачалі. Загатоўку касьцей праспалі.

Як працуюць іншыя кансультанты — Белавус і Бунін — характарызуе наступнае. Яны павялічылі штаты загатоўчага аддзелу непамерна. Як яны самі, так і падпарадкаваныя ім, працаю не нагружаны. Ёсьць у аддзеле маладыя інструктары, якіх кансультанты Бунін і Белавус пучыць ня знаходзяцца, а трымаюцца ад іх замкнута.

Інструктары скарыстоўваюцца не па пастаяннай штодзённай праце, не для жывое сувязі з сыстэмаю інструктаваньня, а толькі, як шкурманы для паасобных заданьняў. Такім чынам, для некаторых інструктароў апэрацыйная работа ў сучасны момант зьяўляецца кітайскаю граматаю.

СЬВЯДОМЫ.

Людзі і факты

Галярэя гультаёў, бюракратаў і валакітчыкаў

Кансультанты загатоўчага аддзелу **Эпштэйн і Белавус** з усіх сіл выбіваюцца, каб давесьці рабочым брыгадзірам, што яны ў сваіх абежніках ніколі не забывалі пра клясавую лінію. Зразумела, яны зусім унікаюць усякіх напамінаньняў аб недахопах і нядбайнасьці ў іх рабоце. Між тым, недахопаў і фактаў бюракратызму ў іх рабоце колькі хочаш. Гэты самы Эпштэйн пасылае вагоны з жывёлай з Украіны ў Полацак, а з Полацку адпраўляе жывёлу ў Віцебск.

Загатоўчы аддзел нагадвае дом адпачынку. Кансультант Белавус нагружаны працай ня больш, чым на 2-3 гадзіны ў дзень. Кансультант на другарадным экспарце **Бунін** клапоціцца за кожную капейку, падыходзіць да кожнай справы з «гандлярскага» пункту погляду, забываючы аб асноўным—плянавай арганізацыі загатовак.

Карэспандэнтка **Іваноўская** палову рабочага дня праводзіць у чэргах ля буфэту і ў гутарках.

Цікавая фігура ўпоўнаважанага па закупцы фруктаў — Гэршона. Добрускі ЦРК просіць прысласць 100 скрынак зімовага ташкенцкага вінаграду — партыямі па 40-50 кілё, на працягу ўсёй зімы. Гэршон пасылае адразу 50 скрынак асеньняга слабога вінаграду, які можа вытрымаць дарогу толькі на працягу 3-5 дзён. Вінаград прыбыў у Добруш, згніўшы на 90%, а рэшта згніла ў Добрушы. Аршанскі ЦРК заказвае 15 пудоў, Гэршон пасылае 100 пуд. Той-жа ЦРК просіць адгрузіць 200 скрынак зімовага вінаграду, Гэршон адпраўляе цэлы вагон, з яго палова асеньняга, слабога. Рэчыцкаму ЦРК замест 5 пуд. адгружаецца 60, з іх 70% браку. Страты ад работы Гэршона дасягаюць некалькіх тысяч рублёў.

Камісіі па чыстцы трэба асабліва зацікавіцца работай агульнага аддзелу і ў прыватнасьці сакратара **Каржуева**. Вось некалькі ўзораў яго работы. Архіў Белкаапсаюзу знаходзіцца ў такім стане, што ніякіх папер туды здаваць нельга, бо здаць гэта, значыць згубіць.

Вось прыклады цяганіны ў бухгальтэрыі. 30 верасьня 1928 г. Добрускі ЦРК прыняў ад садсаюзу 358 скрынь яблык і падпісаў акт, што яблыкі добрыя, адпавядаюць умовам дагавору. 5-га студзеня 1929 г. ён просіць Белрабсэкцыю, каб прадзіяць іх да Белсельсаюзу, бо яблыкі аказаліся гнілыя, бракованыя. Толькі 23-га сакавіка г.г., больш, як праз год, Белрабсэкцыя адказала добрускаму ЦРК, што трэба прыцягнуць вінаватых у нядбайнай прыёмцы і спагнаць з іх страты. Больш году перапіска дажала ў стале бухгальтара т. **Гаўбэрга**.

Самым тыповым бюракратам у БКС зьяўляецца кансультант прамтаварнай групы — **Бэрман**. Ён вядзе перапіску з супрацоўнікамі, якія сядзяць побач з ім. Ён піша свайму сакратару: «Тэрмінова, прашу пагутарыць са мной пра плян завозу», або «Тэрмінова, так-сонаў, прашу пачаць складаньне звод-кі», ці «завесьці рэгістрацыю такую і такую». Тут ня толькі любасьць да пісаніны, тут і «самастраховачка». Я, бач, сваё зрабіў, распарадзіўся, нават адбітак маю.

Вось яшчэ прыклад бюракратычнай «мудрасьці» т. Бэрмана. У Менскім аддзяленьні Гумтрэсту ёсьць 5-7 тысяч пар галёш, прызначаных для спэцвопраткі. Замест таго, каб дагаварыцца з Наркамгандлем і аддзяленьнем Гумтрэсту і разьмеркаваць галёшы прапарцыянальна па акругах, Бэрман піша абежнік спажывецкім саюзам — запытаць усе фабрыкі, заводы, майстэрні, саўгасы, колькі кожнаму прадпрыемству патрэбна галёш, адабраць усе заяўкі і прыслаць у Менск. Што гэта за работа? Дзе тут сэнс?

Паданыя факты бюракратызму тав. Бэрмана адносяцца толькі да апошніх 2-3 месяцаў, між тым, яго імя ня сходзіць са старонак насьценгазэты на працягу **2-х год.**

МАКС.

БЕЛАВУС — афіцыйна кансультант па хлеба-фуражы, а па сутнасьці «адказны» дзепавод. Кіруе загатоўкамі збожжа толькі на паперы.

БУНІН — кансультант па экспарце. У рабоце яго адчуваецца «гандлярскі» падыход. Выпучэнцаў ня любіць—«Мне вучні непатрэбны, дайце працаўніка, вучыць ня буду» — заяўляе ён.

АКТЫЎНАЯ... БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЬ

Роўна год назад, калі толькі пачалася чыстка савецкага апарату, ЦКК-НК РСІ былі даны дырэктывы ўсім установам і грамадзкім арганізацыям ПРЫСТУПІЦЬ ДА ПАДРЫХТОЎЧАЙ РАБОТЫ ПА ЧЫСТЦЫ.

Але ў Белкаапсаюзе не зразумелі важнасьці падрыхтоўчай работы па чыстцы і нічога не зрабілі, каб выканаць дырэктыву ЦКК-НК РСІ.

Камісія па садзейнасьці чыстцы ў БКС была арганізавана толькі з пачаткам працы камісіі ЦКК-НК РСІ.

І вось здавалася, што грамадзкія арганізацыі і адміністрацыя прымуць усе меры, каб паправіць сваю памылку і разгарнуць шырокую працу па дапамозе камісіі па чыстцы. Але мы прымушаны канстатаваць, што і ў сучасны момант «садзейнасьць» праходзіць вельмі марудна.

Брыгадзіры, выпучаныя Белкаапсаюзам, прымаюць вельмі слабы ўдзел. Ужо амаль месяц, як камісія па чыстцы пачала сваю работу, але ніякіх заяў і прапаноў ад супрацоўнікаў Белкаапсаюзу не паступіла. Апарат да чыстці адносіцца «пёляльна». Супрацоўнікі ў дапісчатай форме адказваюць рабочым на іх запытаньні, АЛЕ САМІ НІЯКАЙ ІНІЦЫЯТЫВЫ НЕ ПРАЯЎЛЯЮЦЬ. Гэта сваясабпівае СУПРАЦІЎЛЕНЬНЕ чыстцы. Ні адна арганізацыя БКС ня мела свайго канкрэтнага пляну дапамогі чыстцы. Ніводнага пёзунгу ня было ў памяшканьні БКС.

Такое становішча прымусіла камісію па чыстцы паставіць гэтае пытаньне перад усімі грамадзкімі арганізацыямі і на агульным сходзе супрацоўнікаў. І вось за апошнія дні работа некалькі пайшла ўперад. Загаварыла насьценгазэта. Пачаў думаць аб чыстцы мясцоў.

Але ўсё-ж становішча нездавальняючае. Адміністрацыя яшчэ амаль нічога не зрабіла канкрэтнага для дапамогі чыстцы. На пасяджэньні праўленьня 31 сакавіка па пытаньні аб удзеле ў чыстцы была прынята ад імя праўленьня «адозва» да супрацоўнікаў аб дапамозе камісіі — і ГЭТА ЎСЁ канкрэтнае, аб чым дадумалася адміністрацыя БКС (праз МЕСЯЦ пасьля пачатку працы камісіі).

А плян выпучэнства і падрыхтоўкі замены вычышчаным? Хто аб гэтым падумае?

Затое сакратар праўленьня КАРЖУЕЎ фактычна ЗРЫВАЕ працу камісіі. Ужо месяц, як камісія запатрабавала матар'ялы тэрміновага характару на супрацоўнікаў, але гэтыя матар'ялы да гэтага часу не падрыхтаваны.

Такая дапамога і садзейнасьць нікуды ня вартыя.

Грамадзкія арганізацыі БКС павінны разгарнуць працу па сапраўднай дапамозе камісіі па чыстцы.

ЛЕЎ.

Ці так шэфствуюць?

Мясцкомы Менскага вузла МББ чыг., якія прынялі шэфства над Белкаапсаюзам, аддаюць гэтаму пытаньню вельмі мала ўвагі.

Дагавор па шэфстве на сумесным сходзе быў прыняты яшчэ ў пачатку сакавіка і ляжаў у мясцкоме Белкаапсаюзу бяз руху аж да красавіка. Яшчэ ў пачатку красавіка ён ня быў падпісаны і мясцкомы МББ чыг. і вучкрафсоюз яго не атрымалі.

Пасьля 10-га сакавіка, калі былі вылучаны брыгадзіры для чыстці Белкаапсаюзу, на сходах чыгуначнікаў пытаньне аб чыстцы ня ставілася, брыгадзіры аб сваёй працы не рабілі справаздачы, заданьняў ад мясцкомаў не атрымлівалі. Чыгуначнікі таксама ня верылі пёзунгаў у вочы, як ідэе чыстка. Сярод чыгуначных прадпрыемстваў аб чыстцы няма.

Выходзіць, што пасьля сходу усе заданьні былі, што сапраўдная работа павінна толькі зараз і пачацца. Мяркуць аб гэтым і насьценгазэты чыгуначнікаў.

Вучкрафсоюз таксама мусіць лічыць, што гэта работа яго не ...

Удзельнікі ...

ПАПКОЎ, БЭ...

Пабудуем „зялёны гарадок“

Што робіцца ў Менску для арганізацыі здаровага культурнага адпачынку, для пабудовы «зялёнага гораду», або парку культуры? Вельмі мала, амаль нічога. Хто ведае на прадпрыемствах аб «Антонаўскім лесе?» Дзе абгаворвалі пытаньне адносна паляпшэньня ўмоў летняга адпачынку?

А запатрабаваньні пашырыліся. Аб гэтым гаворыць перапоўненыя дачныя цягнікі ў летні час (да рэчы, цягнікі ідуць толькі на адным маршруце, тады, як трэба было пусьціць у бок Рудзенск —Талька і Калодзішчы—Барысаў).

Мы ляпшэ маем часу пару месяцаў. Адпаведныя арганізацыі павінны падумаць аб тым, як пагнаць прапушчанае і прыняць рэальныя захады да арганізацыі Менскага парку культуры і адпачынку і «зялёнага гарадка».

Мэтазгодна часова арганізаваць дачны гарадок пад Менскам, у Жданові чах, або ў другім месцы. Арганізацыя гарадка патрабуе ня многа сродкаў, а карысьць будзе вялікая. Трэба адвесьці сухую ляістую дачу, пабудаваць там гарадок з палатак, тыпу вайсковых, дзе можна зьмясьціць ня менш 10 асоб у кожнай. Сродкі на пабудову гарадка павінны адшукаць прафсаюзы.

У палатняным гарадку павінны быць арганізаваны усе культурныя гульні, павінна быць рыбалоўлі, сталоўка і буфэт і інш. Акрамя гэтага ў гарадку можна праводзіць пастаянную выстаўковую працу і прапаганду.

Пры гарадку павінен быць пастаянны інструктар па фізкультуры і ваяніза-цыі.

Задача ня вельмі складаная. Трэба толькі ўзяцца за работу ўдарным парадкам.

Н. Б—к.



Будуецца клінічны гарадок на Камароўцы

Прэміяваньне рыбацкіх арцеляй

Для больш рацыянальнага выкарыстаньня рыбных вадаёмаў, для лепшага забесьпячэньня рабочага спажыўца сьвежаю рыбаю, Наркамгандаль БССР, на падставе пастановы Эканомнарады, вылучыў спэцыяльны фонд прэміяваньня рыбацкіх арцеляй і рыбацкіх брыгад пры калгасах. Норма—за 1 цэнтнэр рыбы прэмія ў 8 мэтраў мануфактуры і 6 пачак махоркі. Гэтую прэмію будуць таксама атрымліваць рыбакі-адзіночкі з батрацка-бяднацка-серадняцкай часткі сялянства, якія да гэтага часу яшчэ ня ўступілі ў арцель.

Мануфактура сярод рыбацкіх арцеляй будзе разьмяркоўвацца праз спажывецкія т-вы па даведках рыбгаспадарак «Белрыбы». Махорку будуць выдаваць непасрэдна рыбныя гаспадаркі.

***

«Белрыба» мяркуе адкрыць сёлета ў Менску 2-хтыднёвыя курсы, на якія будзе прынята 100 чалавек, пераважна з найбольш актыўных членаў арцелі і калгасьнікаў-рыбакоў. Мэта курсаў—азнаёміць членаў рыбацкіх арцеляй з найноўшымі спосабамі гадоўлі і поўлі рыбы.

З лістоў рабселькораў

ГЛУШЫЦЕЛІ САМАКРЫТЫКІ

Электраманцёр рэчыцкай запалкавай ф-кі «**Дняпро**» т. **Заіка** звыш трох месяцаў таму назад падаў адміністрацыі ф-кі прапанову аб тым, каб фабрычна-тэлефонную сетку перавесьці з двухправоднай на аднаправодную сыстэму. Ручны выклік абанэнтаў замяніць машынным выклікам ад сеткі пераменнага току. Тав. Заіка падрыхтаваў камутатар цэнтральнай станцыі і асаблівых затрат на пераход не патрабавалася-б. Выгады значныя. Але адміністрацыя на прапанову Заіці не дала ніякага адказу.

Звыш двух месяцаў таму назад Заіка таксама падаў у вытворчую камісію другую прапанову: скарыстаць на практыцы скансструяванае прыстасаваньне да электраматораў. Гэта прапанова мае вялікае значэньне. Але т. Заіка і на гэту прапанову не атрымаў адказу.

У чым-жа справа? А справа, ў тым, што Заіка праз газэты бічаваў каго трэба, у тым ліку і старшага электраманцёра **Тышкевіча.**

Калі Заіка напомніў Тышкевічу аб сваіх прапановах, то апошні склікае камісію са «сваіх» людзей, дзе камісія прызнае прапановы Заіці ня прыгоднымі. У выніку, каб скампрамэтаваць Заіку, як рабкора, адбітак пратаколу пасылаюць у газ. «Полесская Правда» і да гэтага часу Заіку не паведамілі аб выніках.

Гомельская РСІ павінна заняцца гэтай справай.

І. ДЖЭГА.

Рабкор **Заіка** 30 студзеня накіраваў рэдакцыі «Полесская Правда» ліст з цэлым радам допісаў. На канвэрце рабкор наклеіў марку ў 10 кап., ня ўлічыўшы таго, што ліст быў значна цяжэйшы.

Рэдакцыі газ. «Полесская Правда» трэба было за гэты ліст даплаціць 5 кап. Але чамусьці рэдакцыя адмовілася выкупіць гэты ліст. У выніку чаго ліст на пошце праляжаў месяц і быў па запатрабаваньні рабкора 3-га сакавіка вернуты яму асабіста.

Ці правільна паступіла рэдакцыя газ. «Полесская Правда» ў даным выпадку? Безумоўна, не! Яна павінна была неадкладна выкупіць ліст рабкора.

Н.

ПОШТА НЕ ДАЕ КІЁСКАМ ГАЗЭТ

У Гомелі нельга дастаць газ. «Зьвязда» і «Рабочий». Абходзіш усе кіёскі і атрымаеш адзін адказ—«няма».

Падыйшоў я да кіёску № 3 і пытаю

— Ёсьць у вас «Зьвязда»?—Няма!

— Чаму?

— У мінулым месяцы выпісвалася тры экз. (!), а ў гэтым—два.

Такі самы малюнак і ў кіёску № 4.

Пасьля выявілася, што пошта газэты «Зьвязда» кіёскам не дае, бо баіцца, каб газэты не заставаліся.

Тэрмінова трэба належным органам расьсьледаваць гэту справу.

Рабкор.

ДЗЕ АХОВА ПРАЦЫ?

Ахова працы ў **вытворчых арцелях пры БСІКА** пастаўлена дрэнна. Так, пры арцелі № 3 **«Чырвоны Інвалід»** ёсьць абойна-мяблевае аддзяленьне ў 15 кв. саж., дзе працуе 18 рабочых. У памяшканьні падымаецца вялікі пыл, адсутнічаюць: вэнтыляцыя, ручнікі, мыла, кубкі і г. д.

На ватнай ф-цы пры арцелі № 1 **«Чырвоны Кастрычнік»** справа з аховай працы стаіць ня лепш. Машыны не абгароджаны. У выніку ў аднаго рабочага адарвала 4 пальцы. Адміністрацыя аб ахове працы не клапоціцца. Больш таго, няшчасныя выпадкі не рэгіструюцца ў аддзеле аховы працы.

І. ШЭВАХ.

Камгас ня ведае, што робіць

У лютым месяцы аддзел камгаса адвёў Дзяржгандальбелу ў Курасоўшчыне для пашырэньня птушынага гадавальніка 62 дасяціны зямлі. На гэтай плошчы ёсьць шмат хат і садоў, апошнія не агледжаны, зямля не падрыхтоўваецца да засеву. Дзяржгандальбел паабіваў парогі, ходзячы ў камгас, у арэндны стол і г. д., але ніякіх дакумантаў на гэту зямлю не атрымаў. У выніку камгас гэту-ж самую зямлю здае ў арэнду на шэсьць год саюзу саўгандальслужачых пад дом адпачынку.

Выйшла так, што камгас аднэй рукой робіць адно, а другой другое.

Хто вінаваты ў гэтым?

РАБКОР.

ЗЬВЯЗДА. МЕНСК

НОВЫЯ КУЛЬТУРФІЛЬМЫ БЕЛДЗЯРЖКІНО

Белдзяржкіно ўключыла ў свой вытворчы плян на 1930 г. цэлы рад новых культур-фільмаў, сярод якіх амаль ужо гатовы «Кадры Чырвонай арміі» і «Жанчына». У апошнім фільме паказана жыцьцё вясковай і гарадзкой жанчыны, а таксама новы быт. Апрача таго, падрыхтоўваюцца культур - фільмы «Першая ўсебеларуская выстаўка», «Чыгунка» і «Беларускі экспарт».

8 ЧЫГУНАЧНІКАЎ — СТАРШЫНІ СЕЛЬСАВЕТАЎ

8 рабочых Менскага чыгуначнага вузла вылучаны для сталай работы ў сельсаветах Беларусі ў якасьці старшынь сельсаветаў.

Палепшыць працу дамоў селяніна

Сакратарыят ЦВК БССР заслухаў даклад аб становішчы дамоў селяніна ў БССР. За 1929 год праз дамы селяніна на прайшло 250.000 чалавек.

Аднак, абслугоўваньне прыяжджаючых у дамох селяніна пастаўлена нездавальняюча. Санітарнае становішча дамоў дрэннае. Палітыка - асьветная работа не наладжана. Да самага апошняга часу дамы селяніна ня цікавіліся сацыяльным становішчам прыяжджаючых.

Сакратарыят ЦВК запрапанаваў акрвыканкомам правесьці рад мерапрыемстваў па паляпшэньні санітарнага становішча дамоў селяніна, па ўзмацненьні палітыка-выхаваўчай работы і г. д.

АНТЫВЯЛІКОДНЫЯ ВЕЧАРЫ Ў КЛЮБАХ

Пры клюбе рабочых будаўнікоў адкрылася выстаўка антывялікоднай літаратуры і плякатаў. Адбыўся першы антывялікодны вечар для рабочых яўрэяў і іх сямей. Усяго клюбам будзе праведзена 6 антывялікодных вечароў. Бібліятэка папоўнена антырэлігійнай літаратурай.

АДКРЫВАЕЦЦА КЛЮБ ХЭМІКАЎ У БАРЫСАВЕ

1-га мая ў Барысаве адбудзецца ўрачыстае адчыненьне новага клюбу для рабочых хэмікаў. На пабудову яго выдаткавана 288 тысяч рублёў. Заля клюбу разьлічана на 600 чалавек.

ПРЫБЫВАЮЦЬ ТРАМВАЙНЫЯ ВАГОНЫ

Праз 6-7 дзён у Менск прыбываюць з Масквы дадаткова яшчэ 10 трамвайных вагонаў. Па лініі Таварная—Камароўка будзе хадзіць 8 вагонаў замест цяперашніх 5, а па лініі Пасажырская—Старажоўка — 7 вагонаў, замест 4 (іншыя — у рэзэрве).

Трамваі будуць прыходзіць на месцы перапынку праз кожныя 6 мін.

Цэнтральны спартыўны стадыён

Будаўніцтва Цэнтральнага спартыўнага стадыёну ў Менску разгортваецца шпаркім тэмпам. Стадыён разьлічаны на 20.000 чалавек. Адкрыцьцё яго адбудзецца 11-га ліпеня — у дзень сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя вызваленьня Беларусі ад бела-палякаў. На адкрыцьцё стадыёну прыедзе з Швэйцарыі футбольная рабочая каманда.

Радыё-перадача

ПАНЯДЗЕЛАК, 14-га красавіка

17-00—Пасьляабедзены канцэрт.
17-30—Перадача «Юны тэхнік».
18-00—Беларуская радыё-газэта.
19-00—Праверка часу
19-00—Беларуская работніца і сялянка па радыё.
20-00—Рабоча-сялянскі унівэрсытэт па радыё.
21-30—Канцэрт.

АЎТОРАК, 15-га красавіка

17-00—Пасьляабедзены канцэрт.
17-30—Гадзіна абароны краіны і Чырвонай арміі.
18-00—Беларуская радыё-газэта.
19-00—Праверка часу.
19-00—«Чырвоная Зьмена» па радыё.
20-00—Рабоча-сялянскі унівэрсытэт па радыё.
21-30—Канцэрт.

ЗАЎТРА

Рэсп. бюро АРУ. У 18 з пал. гадз. нарада актыву сельска-гаспадарчага сэктару АРУ сумесна з рахунковымі працаўнікамі - добраахвотнікамі і брыгадзірамі, якія зьвярнуліся з часовае працы ў калгасах.

Пасядж. жансэкцыі Кастрычніцкага РК МОПР'у ў 19 гадз.

БДУ. Пэдалёгічны аддзел і-ту пэдагогікі і пэдалёгі запрашае пэдалёгаў, працаўнікоў школьных, і дашкольных установаў і дзіцячых дамоў, а таксама ня пасяджэньне, дактароў на пасяджэньне, якое адбудзецца ў прыродазнаўчым корпусе БДУ (3-ці паверх). Пач. у 20 гадз.

АкрАЗЕТ (Пляц Волі, 23). Пасядж. адбор. камісіі па пасылцы ў Сталінград трактарбуд, Віра-Біджан, Крым і калгасы Менскае акругі. Яўка членаў камісіі абавязкова. Пач. у 19 гадз.

Да ведама нав. працаўнікоў БДУ. МК ВДУ склікае агульныя сходы навуковых працаўнікоў: мэдфаку — 15 красавіка ў 19 гадз. у анатамічным корпусе; ф-таў саўбуду і наргасу — 17-га красавіка ў 19 гадз. (41 аўд.) старога будынку БДУ; пэдфаку (сацыяльна-гістарычнае і літаратурнае аддзяленьні) 18 красавіка ў 19 гадз. 41 аўд.; пэдфаку (фізыка-матэм. і прыродазнаўч. аддз.) і хэмфаку ў 19 красавіка ў 19 гадз. прыродазнаўчы корпус (другі паверх).

Парадак дня сходаў: 1. Новыя задачы ў працы сэкцыі навуковых працаўнікоў, 2. Арганізацыйная пабудова працы па сэкцыі і 3. Выбары бюро калектыву СНП факультэту. Яўка абавязкова.

ПАПРАЎКА

У пляне сьвяткаваньня 1-га мая па Меншчыне, надрукаваным у газэце «Зьвязда» ад 13-га красавіка, упраліся памылкі. У п. 5 наконт урачыстых вечароў на вёсцы надрукавана — «30-та красавіка, 1-га, 2-га і 3-га мая», павінна быць «30-та красавіка, 1-га, 2-га, 4-та мая».

У п. 3 наконт дэманстрацыі у горадзе прапушчана, што асобная калёнай дэманструюць рабочыя, якія ў гэтым годзе ліквідавалі сваю няпісьменнасьць на ліквпунктах.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

17-га красавіка в 7-й гадзіне ўвечары ў залі пасяджэньняў ЦСПСБ адбудзецца

нарада старшынь камісій па аглядзе грамадзкага харчаваньня

разам з старшынямі фабзаўкомаў,

на якой будуць заслуханы справаздачы аглядавых камісій і фабзаўкомаў аб ходзе агляду наступных прадпрыемстваў: 1) заводу «Чырвоная Зара», 2) 1-й дзярждрукарні, 3) заводу «Камунар», 4) шчаціннай фабрыкі і 5) МК № 1 чыгуначнікаў.

На нараду павінны зьявіцца **старшыні аглядавых камісій і фабзаўкомаў наступных прадпрыемстваў:** «Чырвоная Зара», хлебазаводу, дражджавога заводу «Пралетары», цукеркавай фабрыкі «Прагрэс», сьпіртаводачнага заводу, кафэ басная фабрыкі Белмясгандлю, былла-бойні, 1-й дзярждрукарні, шпалернай фабрыкі, друкарні БАН, працкалектыву друкароў, друкарні «Зьвязда», заводаў «Камунар», «Энэргія», «Эльводу», палаты мер і вагі, заводу «Бальшавік», абутковай фабрыкі, шчаціннай фабрыкі, працкалектыву абутнікаў, шалежкай майстэрні Гандальбуду, Унівэрсытэцкага гарадка, кахлянага заводу, Водаканалбуду, «Белдартрансу», вав. «Дрэваапрацоўшчык», швейнай фабрыкі «Кастрычнік», футравай фабрыкі, МК №№ 1, 2 і 3, пасажырск. станц. і № 2 таварнай, пажарнае каманды, гуты «Пралетары», «Чырвоны Хэмік», фармазаводу «Чырвоны Тэкстыльшчык», 1 і 2 рабачкомы грузчыкаў, працкалектыву лямпавікоў і вяровачнікаў.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ КАМІСІЯ ПА АГЛЯДЗЕ ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ. ЦСПСБ.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

Ад ЦКК КП(б)Б

На пасяджэньні ПТ ЦКК КП(б)Б 23-га красавіка, а 18½ гадз. будуць разглядацца справы наступных таварышоў:

Сьвіцкай Базы Рубінаўны, **Сіманенкі** Тодара Якімавіча, **Крыжаўскага** Аўгуста Іванавіча, **Цэнцыпэр** Зосі Сімаўны, **Сушынскага** Якуба Кастусёва, **Сьвірыдовіча** Мікалая Рыгоравіча, **Фэйгіна** Гідэля Селікавіча, **Сандлера** Вульфа Мордухавіча, **Крысіна** Міхаіла Іванавіча, **Каліна** Пятра Ўльяновіча, **Бельскага** Захара Казіміравіча, **Будніка** Рыгора Максімавіча, **Аляшкевіча** Базыля Антонавіча, **Дукшты** Зьмітра Янкавіча, **Васькоўскага** Язэпа Пэйсахавіча, **Ярохава** Фадзея Пракопавіча, **Рамановіча** Кастуся Ціханавіча, **Годкінай** Марылі Самуілаўны, **Федасеева** Івана Арцёмавіча, **Гіршгоўскага** Міхася Ільліча, **Зелячонка** Язэпа Майсеевіча, **Замойскага** Міколы Язэпавіча, **Шчарбініна** Тодара Пятровіча, **Змудзіка** Гірша Наўмавіча і **Штэйнэра** Лова Міхайлавіча.

Усе гэтыя таварышы запрашаюцца прыняць удзел пры выразьненьні іх спраў. Праезд за свой кошт. Запрашаюцца таксама старшыні праверкомаў, якія праводзілі чыстку гэтых таварышоў і сакратары ячэек, дзе яны лічацца на вучоце і знаходзяцца ў Менску.

Ад Менскай АКК КП(б)Б

У сувязі з пастановаю ЦКК УсеКП(б) аб сканчэньні генэральнай чысткі радоў партыі да 1-га мая г. г., Менская АКК КП(б)Б даводзіць да ведама усіх членаў і кандыдатаў партыі, якія не прайшлі чысткі, аб тым, што яны павінны не пазьней 20 красавіка падаць заявы ў АКК з паказаньнем прычын няязкі на чыстку, а таксама ў якой ячэйцы знаходзяцца на вучоце. Заявы прымаюцца штодзенна ад 9 да 16 гадз. у канцэлярыі Менскай АКК (вуч Энгельса, 28).

СЁНЬНЯ

Чарговая канфэрэнцыя працаўнікоў інстытуту аховы працы адбудзецца на заводзе «Бальшавік» сумесна з рабочымі заводу а 3 з паловаю гадзіне дня. Парадак дня: 1) Вынікі дасьледваньня інстытутам заводу «Бальшавік». Запрашаюцца ўсе зацікаўленыя.

Дом Камасьветы. У 19 гадз. (пак. № 21) індывідуальная кансультацыя па матэматыцы і фізыцы т. **Гельфанда.**

— З 19 да 21 гадз. індывідуальная кансультацыя аб задачах калектывізацыі і пасеўкампаніі.

Дом Асьветы. Кіно «Здань, якая не варочаецца». Пач. сэанс. у 20 і 22 гадз.

— У 20 гадз. — пасядж. праўленьня Дому.

Пэгабінэт. У 19 гадз. канфэрэнцыя 3-х груп, перанесеная з 12 сакавіка

— Пасяджэньне сэкцыі грамадзка-карыснай працы пераносіцца на 27-га красавіка.

— У 19 гадз. — пэдалёгічны гурток Антыралігійнае выхаваньне ў дашкольных установах (дакладчыца т. **Вальфсон**).

Паталёга - анатамічны Інстытут. МК ВДУ і прафком мэдфаку склікаюць агульны сход студэнтаў, навуковых і тэхнічных працаўнікоў мэдфаку. Пач. у 20 гадз.

Клюб саўгандальслужачых. Вечар, прысьвечаны месячніку праверкі сацспаборніцтва. Пач. у 20 гадз. Білеты па калектывах.

Агульна-гарадзкі вечар заг. сэктароў вучобы, масавых сэктароў, як КП(б)Б і ЛКСМБ, прапагандыстых, агітатараў пізавога парт. і камс. актыву. Пач. у 19 гадзін у Доме Камасьветы. На парадку дня даклад аб працы Дому Камасьветы за зімовы пэрыяд і задачы на вясеньнялетні час. Пасьля — канцэрт і кіно. Білеты на РК КП(б)Б і ЛКСМБ.

Пасядж. экскурсыйнага бюро пры ЦСПСБ — у 10 гадз. у габінэце старшыні Мэдсанпрацы (Дом Працы).

Клюб саўгандальслужачых. 14-га красавіка ў 16 гадз. — агульны сход рабочых заводу «Камунар», якія шэфствуюць над ВСНГ, разам са служачымі ВСНГ. Парадак дня: 1. Аб працы ВСНГБ (дакл. тав **Стракоўскі**); 2. Аб праверцы працы ВСНГБ і чыстцы яго апарату (дакл. т. Левін). Запраш. рабочыя і служачыя усіх трэстаў і прадпрыемстваў г. Менску, падпарадкаваных ВСНГБ. Прысутнасьць рабочых брыгад і ўдзельнікаў абсьледваньня ВСНГБ абавязкова.

Нарада жонак кампалітскладу Менскага гарнізону.

Аўторак, 15 красавіка

МЕНСКІ АКРУГОВЫ КАМІТЭТ МОПР'у

скліча

Ў ПАМЯШК. АК МОПР'у (Савецкая, 87, 2-гі паверх)

НАРАДУ ЖОНАК КАМПАЛІТСКЛАДУ Менскага гарнізону

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Аб рабоце МОПР'а сярод жонак кампалітскладу і падрыхтоўка да 1-га Мая.

Просьба да ўсіх жонак кампалітскладу зьявіцца без спазьненьня.

Запрашаецца кампалітсклад.

Пачатак роўна а 7 гадз. увеч. **Мен. АК МОПР.**

Сёньня а 7 г. увеч. у памяшканьні клюбу Акрвыканкому рэдакцыяй часопісі „БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА“ СКЛІКАЕЦЦА

ШЫРОКАЯ НАРАДА ЎСІХ РАБКОРАК і СЬЦЕНКОРАК гор. Менску.

ПАРАДАК ДНЯ: 1. Аб кваліфікацыі работніц. 2. Аб задачах часопісі ў сувязі з разгарнаваньнем партапарату.

Пасьля нарады—**канцэрт.**

ЧАРГОВЫ ПЛЕНУМ САЮЗУ САЎГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫХ

склікаецца на 14-га красавіка

а 11 гадз. раніцы ў памяшканьні клюбу саўгандальслужачых гор. Менску

з наступным парадкам дня:

1. Аб пасеўкампаніі і калектывізацыі і чарговых задачах саюзу (дакл. тав. **ПЛЯТНЕЎ**).
2. Аб разгарнаваньні саюзнага апарату і правядзеньні кампаніі аб перавыбарах МК (дакл. т. **ГЛІКІН**).
3. Аб чыстцы сав. апарату і аб удзеле саюзу ў гэтай рабоце (дакл. НК РСІ).
4. Даклад Наркамасьветы аб падрыхтоўцы кадраў і судаклад культсэктару ЦП саюзу.

Запрашаюцца старшыні ўсіх МК і ГК і прафактыў.

Праверка ведаў студэнтаў завочнага рабфаку

Менскі завочны рабфак цалкам выканаў праграму 1-га курсу рабфаку.

У сувязі з тым, што некаторыя студэнты не пасьпелі прапрацаваць усіх 7-мі заданьняў завочнага рабфаку, з прычыны розных перашкод, дэканат рабфаку ўстанаўлене для праверкі ведаў 2 тэрміны: першы тэрмін з 20 па 25 мая г. г., другі тэрмін — з 1 па 5 жніўня г. г.

У маі месяцы будуць выклікацца толькі тыя таварышы, якія цалкам прапрацавалі 7 заданьняў. У гэты час будуць таксама выкліканы студэнты, якія пасцул адсталі ў акадэмічных адносінах, якім патрэбна дапамога рабфаку ў сэнсе самастойнай прапрацоўкі заданьняў.

Усім студэнтам, якія будуць выкліканы ў г. Менск, будуць пасланы літары з 50-процантнай скідкай на праезд па чыгунцы. Батрацкай, бяднацкай частцы студэнцтва, а таксама і калгасьнікам будзе дана дапамога на праезд назад па чыгунцы.

Студэнтам, якія знаходзяцца на адлегласьці 100 кілёмэтраў і менш ад Менску, літары пасылацца ня будуць, яны павінны будуць прыехаць на свой кошт.

У часе праверкі ведаў студэнтам будзе дана агульнае памяшканьне, харчаваньне-ж за свой кошт.

Студэнты-калгасьнікі, а таксама тыя, якія працуюць на вытворчасьці, павінны падаць заяву аб водпуску іх у г. Менск на час праверкі ведаў.

Я—ў.

Кіно-тэатр „КУЛЬТУРА“

З панядзелка, 14 красавіка

Мастацкі фільм вытворчасьці Савкіно

Кіно адчынена з 12 гадз. дня.

ПАКІНУТЫ ВОСТРАЎ

(бегствующий остров) фільм у 6 частках.

Сцэнары **К. Вінаградзкай** паводле аповесьці **Ус. Іванова.** Галоўныя ролі выконваюць: заслуж. арт. **Ю. Васільева, А. Юсаева, А. Панкрышаў, Б. Сьнягіраў** і інш. Мастак —**А. Уткін,** Рэжысэр-апаратар—**А. Разумны.**

Звыш праграмы кіно-хроніка Савкіно № 16:

Масква. Рабочыя заводу № 24 скончылі праверку Масфінаддзелу. **Уладзівастокская акр. га.** 6.000 дэмабілізаваных чырвонаармейцаў з сем'ямі аб'ядналіся ў магутны калгас імя Р. Ваенсавету. **Масква.** Скончыўся працэс над контр-рэвалюцыйнай сэктай Ізувераў братоў Шульц. **Башкірская АССР.** Ваенізаваная эстафэта Хабараўск-Масква.

На дзённых кіно-сэансах дэманструецца вячэрняя праграма

ПАКІНУТЫ ВОСТРАЎ у 6 част.

Звыш праграмы кіно-хроніка Савкіно № 16.

Пачатак дзённых сэансаў: 1-шы—а 1 гадз., 2-гі—3 г. 20 м. Каса з 12 гадз. дня.

Пачатак вячэрніх сэансаў а 7 гадз. увеч. Каса ад 5 гадз. увеч.

Дзённыя кіно-сэансы па агульна-даступных цэнах ад 15 к. да 35 к.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“.

З панядзелка, 14 красавіка, з прычыны посьпеху

2-гі ТЫДЗЕНЬ ПАСТАНОЎКІ 2-гі

НЯМЕЦКІ ФІЛЬМ

МАРЦІН ФАЛЬКХАГЕН

У галоўнай ролі: **ЖЕНІ ПОРТЭН.**

Звыш праграмы кіно-хроніка САВКІНО.

РАСКЛАД СЭАНСАЎ

Дзённыя.	Вячэрнія.
Пачатак 1-га сэансу а 1 гадз. 30 мін.	Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз.
» 2-га » а 3 гадз. дня.	» 2-га » а 8 гадз. 30 мін.
На дзённыя сэансы ўсе білеты па 25 кап.	» 3-га » а 10 гадз. 20 мін.
Каса адчынена ад 12 гадз. дня.	Каса адчынена ад 5 гадз.

КІНО „ПРАЛЕТАРЫ“ **З ПАНЯДЗЕЛКА, 14 КРАСАВІКА**

— 2 фільмы ў адзін сэанс 2 —

1. ПАЛІТАСЬВЕТНЫ ФІЛЬМ

За ваша здароўе ў 5 частках.

У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ: **Чысьцякоў і Блюмэнталь-Тамарына.**

2. ЗАМЕЖНАЯ КАМЭДЫЯ

ЦЁМНЫ КАНЁК

— у 2 частках. —

ПАЧАТАК 1-га СЭАНСУ А 7 ГАДЗ.

КАСА АДЧЫНЕНА З 5 ГАДЗ.

НАВІНКІ

ПАСТУПІЛІ Ў ПРОДАЖ

ТЭЛЬМАН і ШТЭКЕР.—**Пралетарская Нямеччына замест Нямеччыны Юнга**—прамова на пасяджэньні рэйхстагу ў лютым 1930 г. Стар. 56. Цана 20 кап.

БІБЛІЯТЭКА БЯЗБОЖНІКА.

С. ЧАРАЎ.—**Катэхізм бязбожніка.** Практычны дапаможнік для антырэлігійных гурткоў у рабочых, чырвонаармейскіх і вясковых клюбах. Стар. 72. Цана 27 кап.

ТЭАТРАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА.

Ф. ВОЛЬТЭР.—**Роўна а дванаццатай**—драматычны эпізод у аднэй дзеі. Стар. 16. Цана 10 кап.

МАСТАЦКАЕ СЛОВА—МАСАМ.

ТАРАС ГУШЧА (Якуб Колас). **На прасторы жыцьця.** Стар. 166. Цана 45 кап.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТА.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР

Сэзон 1929-1930 году (чацьверты) у Менску

Б. Лаўрэнеў.

Панядзелак, 14 красавіка для саюзу будаўнікоў

РАЗЛОМ

п'еса ў 4-х дзеях.

Рэшта білетаў у касе тэатру і ў рабочай касе. **Пачатак а 8 гадз.**

КІНО „СПАРТАК“

З панядзелка, 14 красавіка

Нямецкі баявік

2-ое ЖЫЦЬЦЁ

Драма ў 7 частках

Пачатак 1-га сэансу а 7 г., 2-га—а 9 г., 3-га—а 10 г. 45 м.

Каса—ад 5 г. 30 м.

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА КАМІТЭТУ ГАРАДЗКОГА УЗАЕМАДАПАМОГІ —

Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Савета, тэл. 12

АДКРЫТА ад 9 гадз. ран. да 9 г. увеч

Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях:

па ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурана-вэнэрычных, страўніцкіх, нэрвовых.

Электра-сьвета-лячэньне і кварц адкрыты з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.

Рэнтген (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 4 г 30 м. да 9 г. увеч.

Прыём хэміка-бактэрыялёгічных аналізаў. Аптэка.

ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. увеч. штодзенна

Кансультацыя прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях па напярэднім запісе.

Урачэбная дапамога на дому па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запісь з 9 гадз. раніцы да 2 гадз. дня.

Дзяжурства дактароў з 2 гадз. дня да 9 гадз. увеч.

Начное дзяжурства дактароў ад 9 гадз. увеч. да 7 гадз раніцы.

Прыём хворых па лекавых кніжках камітэту Для ўсіх іншых грамадзян за агульна-даступную дыфэрэнцыяваную плату.

Кіно „ЮНЫ ПІЯНЭР“

З панядзелка, 14 красавіка, мастацкі фільм

паводле тэмы апавяданьня Анры Барбюса

„ЗДАНЬ, ЯКАЯ НЕ ВАРОЧАЕЦЦА“

мэлядрама ў 7 частках.

У галоўных ролях **О. Жызьнёва і Д. Фельдман.**

Пачатак 1-га сэансу а 2 гадз., 2-га—3 г. 30 м.

Каса адчынена ад 12 гадз.

ЗАОЧНЫЕ ГОСКУРСЫ РОСПИСИ (РАЗРИСОВКИ). Роспись по всевозможным тканям: **мягким** золот., серебр., маслян., рельефн. аниляк. не расплыв. **красками.** Бисер., жемчужн. и мерцающ. **пересыпками. Роспись по сосудам, стеклу, целлулоиду, коже и дереву.** Полный курс, 12 уроков в 4 мес. К урокам дается свыше 100 рис. (кроме текстовых). По оконч. выд. свидет. Уменье рис. не требуется. Проспект и программа высыл. за 20 коп. мел. мар.

ЗАОЧНЫЕ КУРСЫ СОНО.

МОСКВА, ул. Дзержинского, д. 1.

Да ведама ўсіх, хто цікавіцца гаспадаркай, культурай, народанасяленьнем БССР

Паступіла ў продаж кніжка да 10-годзьдзя існаваньня БССР

„БССР У ЛІЧБАХ“

—каштуе са скідкаю 1 руб

Кніжка мае аддзелы: а) палітычны, б) гэрыя, насельніцтва, харчаваньне і жыльлёвы фо в) прамысловасьць і сельская гаспадарка, г) асьвета культура, д) таваразваорот-каапэрацыя, е) трансп і сувязь ды інш.

Кожны партыец, камсамолец, грамадзкі пр цаўнік, настаўнік, ягранам, каморнік, навукова-д сьледчыя ўстановы, савецкія, каапэрацыйныя пр фэсыянальныя, грамадзкія арганізацыі знойдуц патрэбны ім матэрыял у гэтай кніжцы.

Кніжку можна выпісаць і набыць у эканомі статыстычным сэктары Дзяржплану—Менск, Ка ністычная № 16.

Прысылка за кошт заказчыкаў.

МЕНКАМГАС

папярэджвае карыстальнікаў зямельных вучасткаў,

якія знаходзяцца ў межах г. Менску ад Ляхаўскага пераезду да Антонаўскага парку, што, у сувязі з пачаткам работ па будаўніцтве шаша Менск—Магілеў,

ПАМЯНЁНЫЯ ВУЧАСТКІ У ГЭТЫМ ГОДЗЕ НЕ ПАВІННЫ ЗАСЯВАЦЦА.

Весткі аб тым, якія вучасткі не падлягаюць засеву, можна атрымаць у зямельнай частцы Камгасу (Пляц Волі № 2) і на месцы ад тэх. пэрсаналу, які кіруе пабудовай шашы.

МЕНКАМГАС.

МЕНКАМГАС

даводзіць да ведама грамадзян, якія жадаюць атрымаць вучасткі зямлі для пасеву гародніны, бульбы і інш., што ва ўсіх ваколіцах гораду ёсьць некаторая колькасьць

ВОЛЬНЫХ ВУЧАСТКАЎ, ЯКІЯ МОГУЦЬ БЫЦЬ ПРАДАСТАЎЛЕНЫ працоўным пад абработку

Жадаючыя атрымаць вучасткі павінны падаць аб гэтым заяву ў зямельную частку Камгасу — НЕ ПАЗЬНЕЙ 25 КРАСАВІКА Г. Г. —

Пры разьмеркаваньні вучасткаў перавага будзе давацца калектывам.

МЕНКАМГАС.

Для здачы ПЕВЕСТКІ ў газэту „ЗЬВЯЗДА“ звяраце па тэл. 7-81

50 К. кошт пуб лікацыі аб згубе дакумант

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты да 2 гадзін дня

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск.